ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарскому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 73 (4325)
ЧАЦЬВЕР, 31 сакавіка 1932 г.

МЕНСК, Совецкая 63

Сёньня ў нумары

Прывітаньне тав. Сталіна магнітагорцам.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Уласную моцную кармовую базу — сацыялістычнай жывёлагадоўлі. — ВАС ЭРМАН — Разгарнуць капітальнае будаўніцтва 1932 г. (2 стар.). — А. БЭРЗІН, В. МЯЦЕЛЬСКІ — Хэмізацыя — ключ да падвышэньня ўраджайнасьці (3-я стар.). Фан Шы-мін — Здача Шанхаю і барацьба кітайскага пралетарыяту (2 стар.). ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ — Супроць скажэньняў і блытаніны (2 стар.).

Брацьпрыклад з перадавых калгасаў Случчыны і Магілеўшчыны. — Чэрвень, Барысаў і Глуск даюць ганебныя паказальнікі ў загатоўках жывёлы. — Кваліфікаваных плытагонаў і тэхнічныя кадры — з лесазагатовак на сплаў (1 стар.).

ПЯЦІДЗЕНЬНІК БЮРО СКАРГАЎ РСІ. — 20 прадпрыемстваў Менску ўключыліся ў праверку. — Конкурс стахановых брыгад. — Вышэй тэмпы і якасьць барацьбы за пяцігодку (2 стар.).

Аб падрыхтоўцы да будаўніцтва па прамысловасьці і камунальнай гаспадарцы на 1932 год. — Узмацненьне абароназдольнасьці краіны—задача ўсіх працоўных БССР (3 стар.). КІТАЙ — У Шанхаі — балбатня дыпляматаў аб «міры» (4 стар.). Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

ПРЫВІТАНЬНЕ т. СТАЛІНА МАГНІТАГОРЦАМ

МАГНІТАГОРСК,—ГУГЕЛЮ, КАШЧЭНКА, СОБАЛЕВУ, КАРКЛІНУ

Тэлеграф прынёс паведамленьне аб сканчэньні пускавога пэрыяду і разгортваньні першай у СССР гіганцкай домны, якая дае ў дзень звыш 1.000 тон ліцейнага чыгуну, а ў пераводзе на перадзельны чыгун каля 1.200 тон у дзень.

Вітаю рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны варсанал Магнітабуду з пасьпяховым выкананьнем першай часткі праграмы заводу. Вітаю з апаладаньнем тэхнікай першай у Эўропе гіганцкай домны-ўнікум. Прывітаньне ўдарнікам і ўдарніцам Магнітабуду, якія з боем перамаглі труднасьці пуску і разгортваньня домны ва ўмовах зімовай непагоды і з гатоўнасьцю прымалі на сябе асноўны цяжар работы па будаўніцтве заводу.

Ня сумняваюся, што магнітагорцы таксама пасьпяхова выканаюць галоўную частку праграмы 1932 году. пабудуюць яшчэ тры домны Мартэн, пракат і такім чынам з гонарам выканаюць свой абавязак перад краінай.

І. Сталін.

УЛАСНУЮ МОЦНУЮ КАРМОВУЮ БАЗУ—САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Правільная палітыка партыі на вёсцы забясьпечыла хуткі рост таварнай сацыялістычнай жывёлагадоўлі на базе саўгаснага будаўніцтва і калектывізацыі. Нашы саўгасы і калгасныя таварныя фэрмы ўжо дастаўляюць пралетарскім цэнтрам дзесяткі тысяч тон [illegible] малака, мяса.

Рост сацыялістычнай індустрыі і матар'яльнага дабрабыту рабочай клясы і ўсіх працоўных прад'яўляе да сацыялістычнай жывёлагадоўлі новыя вялізарныя запатрабаваньні як у галіне далейшага пашырэньня стада, так і ўзьняцьця яго продукцыйнасьці.

Народна - гаспадарчы плян чацьвертага, заключнага году пяцігодкі намячае вялізарную праграму будаўніцтва ў галіне сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Да канца 1932 году агульнае стада буйной рагатай жывёлы па БССР павінна дасягнуць 1.960.000 шт. і сьвіней — 3.800.000 штук.

Побач з колькасным ростам стада мы павінны ўзьняць яго якасьць, г. зн. павысіць хуткасьпеласьць і жывую вагу жывёлы, узьняць удойнасьць.

Зусім зразумела, што выкананьне гэтых задач непарыўна зьвязана з карэннай рэарганізацыяй і пашырэньнем кармовай базы.

Колькаснае павялічэньне і якаснае палепшэньне жывёлагадоўлі ўпіраецца ў вырашэньне кармовага пытаньня. Кармовая база для жывёлагадоўлі мае такое-ж значэньне, як і апалавая для прамысловасьці. На неадкорме жывёлы ў часе стойлавага перыяду мы кожны год трацім сотні тысяч цэнтнэраў мяса і малака.

Апошні пленум ЦК КП(б)Б завастрыў увагу партыйных арганізацый па кармовым пытаньні. Пленум падкрэсьліў, што «ў 1932 г. павінна быць створана ўласная кармовая база для разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Пасьпяховасьць стварэньня гэтай базы цалкам залежыць ад поўнага выкананьня плянаў веснавой сяўбы і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў засеву кармовых траў і сіласаваньня, вызначыць самае жорсткае выдаткаваньне кармоў».

Мы павінны забясьпечыць поўнасьцю сяўбу кармовых траў і кораньплодаў на запраектаванай плошчы. У гэтым годзе мы павінны засеяць каля 540 тыс. га асноўных кармовых траў, 55 тыс. га кораньплодаў і 30 тыс. га сіласных культур.

Самым адказным момантам у гэтым плане зьяўляецца насеньне траў. Ход ссыпкі кармовых насенных фондаў і загатоўкі траў яўна нездавальняючы. На 20 сакавіка плян ссыпкі аднагадовых траў выканан па рэспубліцы на 45,4 проц., шматгадовых—28,4 проц. Плян загатовак насеньня кармовых траў выканан усяго на 17 проц., кораньплодаў — на 24 проц.

Рад раённых арганізацый праяўляе апартуністычныя адносіны да стварэньня ўласнай кармовай базы і зусім ня кіруе справай ссыпкі і загатоўкі насеньня траў і кораньплодаў. Ня гледзячы на наяўнасьць ліпкаў насеньня кармовых траў, рад калгасаў і вёсак супарта ня выконваюць кантрактацыйных дагавораў з загатоўчымі арганізацыямі. У радзе калгасаў яшчэ не абмалочана насеньне такіх дэфіцытных культур, як канюшына. віка, сэрадэла і лубін. Напрыклад, у Мсьціслаўскім раёне яшчэ не абмалочана 70 га швэдзкай канюшыны. У некаторых калгасах Мсьціслаўшчыны («Чырвоны факом») аказалася па 60 цэнтн. ліпкаў насеннай віку. Замест здачы на склады Насенканторы пад уплывам кулацкіх агентаў насенную віку пачалі былі разбазарваць. Калгас «Камінтэрн», Койданаўскага раёну, намаланіў звыш 16 цэнтн. канюшыны, а па кантракту цыйным дагаворы ня здаў ніводнага кілё. Такія раёны, як Веткаўскі, Церахаўскі, Тураўскі і Патрыкеўскі не загатовілі ніводнага кілё канюшыны.

У сувязі з ліквідацыяй райкаапсаюзаў і перадачай загатоўкі насеньня траў спажывецкай кааперацыі, у 35 раёнах загатоўкі амаль зусім спынініся. Спажывецкая кааперацыя зусім ня цікавіцца гэтай справай. Ліквідкомы райкаапсаюзаў усякімі спосабамі зацягваюць перадачу загатоўленага насеньня спажывецкай кааперацыі, а насобныя райкаапсаюзы, як Сіроцінскі, Віцебскі, Лоеўскі, пачалі нават разбазарваць загатоўленае насеньне траў.

Апартуністычная недаацэнка важнасьці стварэньня ўласнай кармовай базы, кулацкія спробы разбазарыць насеньне кармовых траў і кораньплодаў павінны сустрэць зьнішчальны адпор як з боку цэнтральных, так і раённых арганізацый. Трэба ўсімі сіламі ня дапусьціць ссыпку і загатоўку насеньня кармовых культур. Практыка перадавых калгасаў БССР, як «Камбайн» (Случчына), «Барацьбіт», імя Леніна, «Маяк» (Крычаўскага раёну) і інш., якія здолелі мабілізаваць унутраныя рэсурсы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, своячасова ссыпаць насенныя фонды і сабраць значную колькасьць насеньня ў фонд міжкалгаснай узаемадапамогі, павінна паслужыць прыкладам для ўсіх калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў БССР. Ні адзін гэктар, вызначаны пад кармовыя травы і кораньплоды, не павінен застацца не засеяным.

Наступнай, ня менш важнай задачай, зьяўляецца правільнае скарыстаньне паўных лугоў і выпасаў. Шляхам прасьцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў, як зьнішчэньне куп'я, рэгуляваньне вадастоя, баранаваньне, мы можам дабіцца значнага павышэньня ўраджайнасьці сенажацяй і выпасаў. Наркамзем БССР вызначыў плян прасьцейшых мерапрыемстваў па палепшэньні сенажацяй і выпасаў на плошчы ў 450 тысяч га. Гэты плян трэба ва што - б там ні стала выканаць. Нарэшце, неабходна практычна прыступіць да закладкі вясной г. г. штучных выпасаў. Трэба памятаць, што добры выпас можа замяніць большую частку канцэнтраваных кармоў. Культурныя выпасы даюць зялёныя сакавітыя кармы, якія спрыяюць добраму росту маладняка і ўзьняцьцю ўдойнасьці жывёлы.

Пры вырашэньні кармовай праблемы асаблівую ўвагу мы павінны зьвярнуць на сіласаваньне. У аснову нашай сацыялістычнай жывёлагадоўлі трэба пакласьці культурныя выпасы і сіласаваньне — кармленьне зялёным кормам улетку і сіласам зімою.

У мінулым годзе ў справе сіласаваньня мы дасягнулі пэўных посьпехаў, але не ў такіх разьмерах, якія нам патрэбны. Калі ў 1930 г. на адну аграмаджаную карову мы мелі 0,4 тоны сіласу, дык у 1931 г. мы мелі 1,5 тоны.

У гэтым годзе плян сіласаваньня вызначан у разьмеры 1.200 тыс. тон — па 2,5 тоны сіласу на штуку рагатай жывёлы. Сустрэчнымі плянамі мы павінны дабіцца, каб на штуку кожнай рагатай жывёлы прыпадала ня менш 3,5 тоны сіласу. Гэтым мы забясьпечым у патрэбнай колькасьці сакавітымі кармамі нашу жывёлу на ўвесь стойлавы пэрыяд. Леташняя практыка перадавых саўгасаў і калгасаў БССР паказвае, што гэта заданьне зусім рэальнае. Трэба максымальна скарыстаць раньняе сіласаваньне, скарыстаць на сілас зельле, дзікія травы і гароднія адкіды. У мінулым годзе з прычыны няўхільнага асноўных правіл агратэхнікі, як позьняя сяўба, дрэнны догляд пасеваў, вызначэньне для сіласу самых горшых вучасткаў, мы мелі, надзвычай нізкі ўраджай сіласных культур — у сярэднім 9 - 10 тон зялёнай масы з гэктара. Своячасовай сяўбой сіласных культур на загадзя вызначаных належных зямельных вучастках, добрым доглядам і прапоркай пасеваў мы павінны дабіцца ня менш 20 тон зялёнай масы з га.

Плян сенаўборачнай кампаніі 1932 году вызначан на плошчы да 2-х млн. га. Пасьпяховае яго правядзеньне забясьпечыць наша стада грубымі кармамі на 1932 - 33 г. Тут трэба цьвёрда памятаць, што своячасовае правядзеньне касьбы забясьпечыць нам палепшэньне якасьці грубых кармоў на 20 - 25 проц. Пры гэтым ужо зараз неабходна паставіць пытаньне аб зьняцьці двух укосаў, што значна павялічыць нашы кармовыя рэсурсы.

Да вырашэньня кармовага пытаньня трэба прыцягнуць шырокія масы рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў шляхам абмеркаваньня яго на вытворчых нарадах, калгасных сходах. Ужо зараз трэба ўжыць практычныя меры да пашырэньня пасеваў кармовых траў і кораньплодаў, да стварэньня ўласнай кармовай базы ў кожным жывёлагадоўчым саўгасе і калгасе.

За апошні час у пасобных раёнах Савецкага Саюзу мелі месца грубыя скажэньні ў калгасным будаўніцтве, якія выявіліся ў прымусовым аграмаджаньні кароў, сьвіней, птушак, што засталіся ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове «Аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы» своячасова выкрыў гэтыя «лявацкія» скажэньні, **якія ня маюць нічога агульнага з палітыкай партыі**, якія ідуць у разрэз з неаднаразовымі дырэктывамі ЦК нашай партыі, парушаюць статут сельска - гаспадарчай арцелі, вядуць да пераскакваньня праз асноўную на даным этапе форму арцельнай стадыі разьвіцьця калгасаў. У сваёй пастанове ЦК УсеКП(б) з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што **«толькі ворагі калгасаў могуць дапускаць прымусовае аграмаджаньне кароў і дробнай жывёлы ў пасобных калгасьнікаў».**

«Задачу пашырэньня стада і гадаваньня маладняка ў калгасах сёньня нельга вырашыць без актыўнага ўдзелу ў гэтай справе кожнага калгасьніка» («Правда»). Пры сучаснай арцельнай форме калгасаў неабходна, каб кожны калгасьнік меў сваю жывёлу. **«Задача партыі заключаецца ў тым, каб у кожнага калгасьніка была свая карова, дробная жывёла, птушка»** (з пастановы ЦК).

ЦК прапанаваў усім партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям спыніць усякія спробы прымусовага аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, выключаючы з партыі вінаватых у парушэньні гэтай дырэктывы. Разам з гэтым ЦК прапанаваў **«арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць кароў і дробнай жывёлы, у куплі і гадаваньні маладняка для асабістых патрэб».** Раённыя арганізацыі, праўленьні калгасаў павінны выявіць магчымасьці аказаньня гэтай дапамогі шляхам прадастаўленьня пазыкі па набыцьцё кароў і дробнай жывёлы.

У сувязі з набліжэньнем веснавой сяўбы мы павінны зараз дабіцца, каб кожны калгас у сваіх пасеўных плянах прадугледзеў забясьпячэньне кармамі ня толькі аграмаджанага стада, або фармы, **а таксама і жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў.**

Пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка трэба шырока папулярызаваць сярод калгасных мас, рашуча змагаючыся з правымі і «левымі» апартуністамі, з усякімі скажэньнямі лініі партыі ў калгасным будаўніцтве і спробамі ігнараваньня сельска - гаспадарчай арцелі, як асноўнай формы калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

На ўсебеларускім зьезьдзе працоўных літоўцаў

На вячэрнім пасяджэньні 29 сакавіка на 2-м усебеларускім зьезьдзе працоўных літоўцаў, сустрэнуты працяжнымі воплескамі, выступіў з вялікай прамовай сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. **Жаброўскі.** У сваім выступленьні тав. Жаброўскі ахарактарызаваў першачарговыя задачы гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва, якія выцякаюць з пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Прывітаньне зьезду ад Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі Літвы перадаў тав. **Міцкевіч-Капсукас.**

***

На раніцнім пасяджэньні 30 сакавіка шырока разгарнуліся спрэчкі па дакладу тав. **Бучукаса** аб нацыянальна-культурным будаўніцтве. У спрэчках выступалі т. т. **Шукіс** (Дымавэўская літоўская ШКМ), **Пікьюўскі, Юліна, Жальніс, Лапеніс, Вілукас, Багачунас** (рабочы менскай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік»), **Ушкальніс** (Масква), **Петраціс** (настаўнік літоўскай школы), **Хацкевіч, Сэрбэнта, Анацкайцэс, Свацаліс, Дакальская** (настаўніца), **Бекевіч, Матулайціс** (БАН), **Даўбарас** (рабочы, Масква).

Таксама па дакладу т. Бучукаса з вялікай прамовай выступіў тав. **Міцкевіч-Капсукас.**

На вячэрнім пасяджэньні 30 сакавіка зьезд заслухаў заключную прамову тав. **Бучукаса.**

БРАЦЬ ПРЫКЛАД З ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ СЛУЧЧЫНЫ І МАГІЛЕЎШЧЫНЫ,

якія высоўваюць сустрэчныя пляны пасеўнай і разгортваюць мабілізацыю насенных рэсурсаў

Узор міжкалгаснай узаемадапамогі

СЛУЦАК, 29. Калгас імя К. Маркса, Ленінскага сельсавету, ссыпаўшы насенны і страхавы фонды, склаўшы кармовы фонд на час веснавой сяўбы, адлічыў у фонд насеннай міжкалгаснай узаемадапамогі 166 цэнтн. бульбы, 17 цэнтн. вікі, 6 цэнтн. грэчкі і 5 цэнтн. гороху.

Калгас паказвае ўзор работы па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў насеньня (Белта).

***

ВУШАЧЫ. Калгасы «Прымежны калгасьнік», «Новае жыцьцё» і «Адважны барацьбіт» разгарнулі ўнутрыкалгасную і міжкалгасную ўзаемадапамогу. У першых двух калгасах шляхам рэалізацыі пазыкі імя конкурсу «Правды» сабрана 150 цэнтн. бульбы і некалькі дзесятаў цэнтн. збожжавых.

Толькі ў выніку гэтага калгасы ліквідавалі прарыў у ссыпцы насенных фондаў (Белта).

***

СЛУЦАК. Калгас «Камбайн», які першым у раёне ссыпаў насенныя і страхавыя фонды, паказвае ўзор шырока разгорнутай работы па мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў і міжкалгаснай узаемадапамогі і рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі імя конкурсу «Правды».

У калгасе не хапала насеньня гародных культур. Але брыгада з лепшых ударнік калгасу — Давідовіч М., Каралік Ганны, Давідовіч Насьці, Казёл Марты і Казёл Ганны, шляхам абыходу калгасьнікаў і растлумачальных гутарак сабрала патрэбнае насеньне гуркоў, капусны расады, морквы, рэдзькі і цыбулі. Ударніцы-зборшчыцы насеньня прэміраваны.

У фонд міжкалгаснай узаемадапамогі «Камбайн» адлічыў 3 цэнтнэры насеньня збожжавых культур, сабраны сярод калгасьнікаў 2 цэнтн. Апрачы ўжо зданых у Насенвоэсаюз 500 кгр. канюшыны калгас падрыхтаваў да здачы яшчэ 2 цэнтн. і 0,5 цэнтн. буракоў.

Распачата распаўсюджаньне аблігацый насеннай пазыкі калгаснай узаемадапамогі імя конкурсу «Правды». У парадку сацыялістычнага спаборніцтва калгасьнікі дадаткова падпісваюцца на пазыку. Напрыклад, калгасьнік Маглыш Пятро падпісаўся на 8 кгр. насеньня ільну і 8 кгр. аўса. Вышанскі Сьцяпан — на 16 кгр. ільнанасеньня. Усяго сабрана па падпісцы сярод калгасьнікаў 150 кгр. насеньня. Гэта — толькі пачатак шырокай работы па распаўсюджаньні аблігацый насеннай пазыкі.

Работа працягваецца ўдарнымі тэмпамі.

Калгас «Камбайн» абавязаўся, што ў яго ёсьць для абмену 2.400 кгр. гатунковага аўса «залаты дождж» і ячменю добрай усхожасьці—1.600 кгр.

Брыгада «Белта»:
Хаўнін, Бугроў.

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ

Магілёў (Наш кар.)

Магілеўскі раён зьяўляецца жывёла гадоўча - саловагароднім. Таму асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на ссыпку насенфондаў траў і гароднінны. Райпартарганізацыяй даны выразныя ўказаньні, што рабіць на мясцох сельсаветам і парт'ячэйкам у гэтай галіне.

Асобныя партыйныя ячэйкі і сельсаветы пераключылі на даны вучастак работы ўсе наяўныя сілы. Прыклады бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне пасеўных плянаў паказваюць калгасьнікі калгасу «Колас», Гарадзішчанскага сельсавету, якія пры абгаварэньні пляну патрабавалі ад праўленьня павялічэньня плошчы пад кармовыя культуры. Апартуністы з праўленьня пярэчылі, выступалі супроць жыцьцёвых патрабаваньняў калгасьнікаў. Аднак, актыў калгасьнікаў і ў прыватнасьці працуючыя на МТФ высунулі сустрэчныя пляны (па канюшыне — 6 га, па бульбе 59, па кораньплодах — 12 га, па віцы — 5), якія і былі прыняты на сходзе. Былі арганізаваны брыгады, якія сярод калгасьнікаў сабралі патрэбную колькасьць насеньня. Асаблівую актыўнасьць у гэтай рабоце праявілі жанчыны - ўдарніцы.

Ня меншую работу правялі і калгасьнікі калгасу «Адраджэнец», якія павялічылі плян пасеву канюшыны на 40 проц. і сабралі патрэбную колькасьць насеньня.

Аднак ня ўсюды праводзіцца мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў. Некаторыя мясцовыя арганізацыі (Слабодзкі, Дашкаўскі, Шчэжэцкі сельсаветы) недаацэньваюць значэньня барацьбы за насеньне. У выніку па раёне на 15 са кавіка сабрана насеньня канюшыны 11,2 проц., вікі — 17,7 проц., збожжавых культур — 71 проц.

Бюро райкому партыі апаніла такое становішча з ссыпкай насеньня па раёне, як яўна нездавальняючае і накіравала на раён адказных работнікаў, якім дала строгія дырэктывы — у блі жэйшыя дні дабіцца выкананьня пляну засыпкі насеньня. **Прахарэнка.**

Су-лін-дзі — прэміраваны ўдарнік кітайскага нац. калгасу (Віцебшчына).

Аднаасобнікі ня ведаюць дзе сеяць

ВУШАЧЫ. У Вушацкім раёне масавая растлумачальная работа сярод аднаасобнікаў аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, ссыпцы страхавых фондаў і рэалізацыі насеннай пазыкі замяняецца голым адміністраваньнем.

У Завячынскім сельсавеце ў выніку галавацяпскага ніпаваньня райземанддзелу 70 проц. аднаасобнікаў ня ведаюць, дзе яны буць вясной сеяць. Толькі зараз ім вызначылі зямлю, але аб гэтым яшчэ не паведамілі.

Замест масавай растлумачальнай работы старшыня РВК на курсах старшынь сельсаветаў фактычна раіў даваць бедняком і сярэдняком аднаасобнікам цьвёрдыя заданьні па сяўбе. Што датычыць ссыпкі насенных фондаў, ён раіў «заглядаць у сьвірны».

Гэтым «лявацкім» заскокам, захапленьням мэтадамі адміністраваньня трэба пакласьці канец. Толькі разгортваньнем масавай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і беднякоў і сярэднякоў — аднаасобнікаў, арганізацыяй міжкалгаснай насеннай узаемадапамогі і распаўсюджаньнем насеннай пазыкі партарганізацыя здолее вывесьці раён з глыбокага тылу падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Брыгада «Зьвязды»: Сакалоўскі, Барысэвіч, Машніцкі, Крыжэвіч.

Ліквідаваць абязьлічку ў складаньні апэрацыйных зводак

Крычаўскі райкалгассаюз і райзаг сваёй непаваротлівасьцю, ня толькі не забясьпечваюць выкананьня вызначаных пленумам РК тэрмінаў аб завяршэньні падрыхтоўкі да сяўбы — 1-га красавіка, а, наадварот, бязьдзей нічаюць у справе кіраўніцтва калгасамі.

Апэрацыйныя зводкі складаюцца ім праз кожныя 10 дзён. Складаньне зводак праводзіцца вельмі фармальна, бяз крытычнага аналізу, бяз ўліку фактычнага становішча на мясцох.

Усе зводкі ёсьць вынік простага бухгальтарскага падліку (зьвядзеньне балянсаў). На мясцох у цэлым радзе калгасаў ёсьць тэндэнцыі месьніцкага парадку, якія накіраваны на захаваньне ліпкаў, а таксама на атрыманьне дапамогі ад дзяржавы. Райкалгасаюз ня толькі не выкрывае гэтых фактаў, а сваёй штампоўкай фактычна іх узаконьвае.

Так, калгас «Барацьбіт» на працягу двух дзён даваў розныя весткі, або недахапае насеньня, фактычна-ж высьвятлілася, што ён на ўсіх культурах мае ліпкі. Ёсьць рад выпадкаў «очковтирательства». Яны таксама ўзаконьваюцца зводкамі райза, а потым НКЗБ. Трэба зараз-жа ўзьняць пытаньне аб карэннай рэарганізацыі складаньня зводак. Мы прапануем, каб кожны раз пад зводкамі калгасаў, якія дасылаюцца ў сельсаветы, падпісаліся кладаўшчыкі калгасаў і члены сельсавету. Трэба прыцягваць да суровай адказнасьці «очковтирателей». Райкалгассаюзы павінны раз у два ты дні праз свой апарат на мясцох правяраць фактычнае становішча насенных фондаў.

ПКЗ павінен устанавіць такую сыстэму справаздачнасьці, пры якой была-б ліквідавана абязьлічка і ўзьнялася адказнасьць за складаньне зводак.

Трэба таксама, каб справаздачнасьць у зводках раёнаў была больш спрошчанай.

Брыгадзір «Зьвязды»—Дзялюк.

Кулацкі агент Дарагуж заклікае калгасьнічаў... пачакаць

Койданава. (Ад нашага спэцкора). Калгас «Пралетары» — адзін з буйнейшых калгасаў раёну. Ён павінен засеяць у гэтым годзе 487 га. Але для засеву гэтай плошчы не хапае насеньня: вікі — 30 цэнтн., аўса — 72 цэнтн., бульбы — 375 цэнтн. і 15 цэнтн. пшаніцы.

Усе магчымасьці для поўнага забясьпячэньня пасеўнай плошчы насенным у калгасе ёсьць. Увосень мінулага году ў калгас уступіла шмат бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак, якія і да гэтага часу не аграмадзілі патрэбнага насеньня. Старэйшыя калгасьнікі патрабуюць ад праўленьня і ад старшыні калгасу прыняць тэрміновыя меры для хутчэйшага збору насенных і страхавых фондаў. Але - ж Дарагуж (старшыня калгасу, таксама ўступіў у калгас увосень мінулага году), сам не аграмадзіў насеньня і супакойвае калгасьнікаў, кажучы: «з насеньнем, моў, пачакайце, яшчэ невядома, што будзе да вясны».

З прыведзеных фактаў відаць, што старшыня калгасу «Пралетары» Дарагуж самым выразным чынам хоча сарваць пасьпяховую падрыхтоўку да веснавой сяўбы і адно з важнейшых зьвешняў — збор насенных фондаў.

Калгасьнікі, якія яшчэ не аграмадзілі свайго насеньня, заяўляюць, што калі старшыня аграмадзіць насеньне тады і яны пасьледуюць яго прыкладу.

Райкалгассаюз павінен тэрмінова прыняць рашучыя меры да аздараўленьня калгасу «Пралетары».

А. М-коў.

Кваліфікаваных плытагонаў і тэхнічныя кадры—з лесазагатовак на сплаў

Абавязацельствы Бабруйскага леспрамгасу

Адкрыты ліст да Парыцкага, Асіпавіцкага, Клічаўскага, Бярэзінскага, Крупскага, Барысаўскага, Плешчаніцкага, Бягомльскага, Лагойскага, Смалявіцкага, Чэрвеньскага, Бялыніцкага, Аршанскага, Дубровенскага, Шклоўскага, Быхаўскага, Рагачоўскага, Слуцкага, Вузьдзенскага і Капыльскага леспрамгасаў

Посьпех лесасплаву ў значнай меры залежыць ад таго, наколькі своячасова будзе падвезен лес да прыстаняй, наколькі своячасова і ўсебакова сплаўныя арганізацыі падрыхтуюцца да пачатку сэзону.

Бярэзіна - Дняпроўская сплаўная кантора — адна з асноўных у БССР — вельмі слаба падрыхтавана да лесасплаву. Значная доля віны ў гэтым падае на леспрамгасы. Ня вывезен поўнасьцю яшчэ лес да прыстаняй. Кантора ня мае патрэбнай колькасьці кваліфікаваных кадраў (тэхнікаў, дзесятнікаў, прыёмшчыкаў) для сартоўкі, укладкі і ўвязкі лесу.

Для таго, каб дапамагчы канторы ў фарсаваньні тэмпаў падрыхтоўкі да сплаву, Бабруйскі леспрамгас бярэ на сябе наступныя самаабавязацельствы:

1. Вывезьці увесь загатоўлены лес да прыстаняй.

2. **Вылучыць патрэбную колькасьць тэхнічных кадраў.**

3. Вылучыць 4-х адказных працаўнікоў у дапамогу па вярбоўцы сплаўшчыкаў.

Мы заклікаем вас пасьледаваць нашаму прыкладу і дапамагчы згульнымі сіламі Бярэзіна - Дняпроўскай сплаўнай канторы па - баявому падрыхтавацца да сплаўнай кампаніі.

Дырэктар леспрамгасу **Левін.**
Сакратар парт'ячэйкі **Нудэль.**
Старшыня рабочкому **Фрыцляндз.**

Барысаўскі вучастак да сплаву не падрыхтаван

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Паводле лесаматар'ялаў да прыстаняй Барысаўскага вучастку Бярэзіна-Дняпроўскай сплаўной канторы праходзіць недавальняюча. Па сёньняшні дзень падвезена ня больш, як 65 проц. патрэбнай колькасьці.

Яшчэ горш справа з сартоўкай, прыёмкай і ўкладкай падвезенага лесу. Паводле дагавору ўсе леспрамгасы, якія падвозяць лес да прыстаняй, павінны своячасова рабіць і яго сартоўку. Аднак, Барысаўскі, Смалявіцкі, Плешчаніцкі леспрамгасы гэтага пункту дагавору ня выконваюць. У выніку лес не адсартаваны па гатунках і разьмерах, і ня прыняты яшчэ канторай вучастку, што затрымлівае яго ўкладку.

Вучастак зусім не забясьпечан кваліфікаванымі кадрамі. Згодна дырэктывы Лесбелу, усе тэхнікі і дзесятнікі, якія ў мінулым годзе працавалі на сплаве і зараз заняты на лесазагатоўках, павінны быць вернуты лесасплаўным канторам. Але леспрамгасы ўпарта супраціўляюцца выкананьню гэтай дырэктывы. Так, Барысаўскі леспрамгас замест 10 чалавек адпусьціў толькі аднаго. Лагойскі замест 9 таксама 1, Плешчаніцкі і Бягомльскі зусім нікога не адпускаюць.

Ня лепш справа з забясьпячэньнем сплаву ўвязачным і іншымі матар'ялямі. На 25 сакавіка загатоўлена і дастаўлена да прыстаняй гужбы ня больш, як 50 проц. патрэбнай колькасьці.

Вывезьці ўвесь загатоўлены лес

За зрыў вывазкі старшыня Грычанскага с.-с. Вароніч зьняты з работы і аддаены пад суд

Нядаўна адбылося нечарговае пасяджэньне прэзыдыуму Менгарсавету па пытаньні выкананьня пляну лесавывазкі па Менскім раёне.

Заслухаўшы інфармацыю старшынь Сеньніцкага, Бараўскага і Грычанскага сельсаветаў, прэзыдыум канстатаваў, што, ня гледзячы на катэгарычныя прапановы гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму гарсавету аб фарсаваньні вывазкі лесаматар'ялаў, квартальнае заданьне на 25 сакавіка выканана толькі на 55,8 проц.

Недапушчальна дрэнна стаіць справа па Бараўскім сельсавеце, які за ўвесь зімовы час вывез усяго 17 кбм. Сеньніцкі сельсавет з патрэбных 200 кубамэтраў вывез 79, Грычанскі — з 200 кбм. паводле заданьня вывез толькі 15 кбм.

Такое ганебнае адставаньне тлумачыцца адсутнасьцю кіраўніцтва лесавывазкай з боку старшынь сельскіх саветаў. Апошнія, замест упартай барацьбы за выкананьне заданьня партыі і ўраду, праявілі поўную апартуністычную бязьдзейнасьць. Старшыня Грычанскага сельсавету т. Вароніч сьвядома зрываў лесавывазку, ня прымаючы ніякіх захадаў да кулацка - заможных гаспадарак, што яя выконвалі цьвёрдых заданьняў.

Прэзыдыум гарсавету прапанаваў старшыням сельскіх саветаў прыняць усе меры да таго, каб план лесавывазкі ў бліжэйшыя дні быў выканан поўнасьцю.

За зрыў вывазкі лесаматар'ялаў, за апартуністычную бязьдзейнасьць, за аслабленьне работы ва ўсіх галінах старшыня Грычанскага сельсавету Вароніч зьнят з працы і аддан пад суд. Справа перадана ў гараджскую кантрольную камісію КП(б)Б. Прэзыдыум і пленум гарсавету адпагалосна пастанавілі вывесьці тав. Вароніча і са складу гарадзкога савету.

Л.

Папярэдзіць зрыў сплаву

ВІЦЕБСК (БЕЛТА).

Віцебскай сплаўнай канторы ў гэтым годзе патрэбна 2.300 плытагонаў. Вярбоўка-ж іх яшчэ не распачалася.

Не хапае для сплаву такелажу і гужбы. На 25 сакавіка вітак для гужбы загатоўлена толькі 30 проц. патрэбнай колькасьці. Не забясьпечаны прыстані лодкамі, вяроўкамі і іншымі прыладамі.

Дрэнная справа са снабжэньнем. З патрэбных 5.000 пар ботаў для плытагонаў прыслана толькі 500, але і яны вельмі малога разьмеру.

Толькі 40,2 проц.

ШКЛОЎ. Шклоўскі леспрамгас — самы адсталы ў лесавывазцы па БССР. На 25 сакавіка квартальнае заданьне па вывазцы дзелавой драўніны выкананa толькі на 40,2 проц. Асабліва дрэнна вывозіцца экспартная драўніна.

Рад сельсаветаў (Рыжкоўскі, Загаранскі, Камсінецкі, Сьліжкоўскі) сваё заданьні па лесавывазцы выкапалі ад 14 да 16 проц. Калгас «Ленінскі шлях», згодна дагавору з леспрамгасам, павінен вывезьці 200 кбм., але на сёньняшні дзень ён зусім не выяжджаў па лесавывазку.

ВАСЭРМАН

РАЗГАРНУЦЬ КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА 1932 г.

Капітальнае будаўніцтва 1931 г., якое аллюстроўвала вялізарныя посьпехі ў індустрыялізацыі краіны, дало магчымасьць пусьціць у эксплёатацыю рад такіх буйных аб'ектаў, як Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат, мічаціны камбінат, панчошную фабрыку ў Віцебску і г. д. Аднак, плян будаўніцтва выканан толькі на 77,4 проц. Частка аб'ектаў (ацэтонавы, трубаліцейны заводы і інш.), якія пачаты ў 1930-31 годзе, павінны быць ва што-б тым ні стала скончаны і пушчаны ў сарадзіне 1932 г. Але мерапрыемствы па падрыхтоўцы да будаўніцтва, якія прадвезены ў першым квартале 1932 г., зьяўляюцца абсалютна недастатковымі і не даюць упэўненасьці ў тым, што ў маі можна будзе разгорнутым фронтам прыступіць да будаўніцтва.

Пастанова СНК аб заключэньні дагавораў на будаўніцтва да 1 сьнежня 1932 г. з тым, каб будаўнічыя арганізацыі змаглі своечасова падрыхтавацца да работ (скарыстаць зімовую дарогу для падвозкі будматар'ялаў, падыхтаваць рабочую сілу), фактычна ня выканана. Толькі нязначная частка гаспадарчкаў зьявіліся для заключэньня дагавораў ды і то без праектаў, чарцяжоў і кашчатковых каштарысаў. Большасьць-жа гаспадарчых арганізацый нават і гэтага не зрабіла. Яны напэўна лічаць, што зараз аб будаўніцтве гаварыць не патрэбна.

У студзені быў заключан дагавор на будаўніцтва мылаваранага заводу ў Гомелі коштам у 600.000 руб. з умовай — пачаткова прыступіць да будаўніцтва, але да гэтага часу нішчо няма праектаў і невядома, калі яны будуць. Няма праектаў, дагавору і рабочых чарцяжоў будаўніцтва кінофабрыкі ў Віцебску, на якую мяркуецца адпусьціць 1 млн. руб. Такіх выпадкаў можна прывесьці шмат.

Многія арганізацыі толькі зараз зварачаюцца да праектных устаноў з просьбай тэрмінова «зрабіць праект будаўніцтва». У адказ на заўвагу, што праектнае бюро перагружана і зрабіць гэтага тэрмінова нельга, яны абяцаваюць Белдзяржбуд у зрыве будаўніцтва. А дзе-ж яны былі раней.

Дрэнна стаіць справа са спабжэньнем будматар'ялам.

Сыстэма спабжэньня, якая зараз існуе, пры якой фонды разьмяркоўвае Дзяржплян, нарады атрымліваюць і плацяць за матар'ялы работадаўца, рэалізуе фонды Белдзяржснаб, а будканторы толькі часткова зьяўляюцца «штурхачом» для адгрузкі матар'ялаў, не даюць магчымасьці наладзіць плянавае забесьпячэньне будматар'ялам. Бываюць выпадкі, калі ў работадаўцаў не знаходзіцца сродкаў на выкуп будматар'ялаў, і банк прадае іх з таргоў таму, у каго гэтыя сродкі ёсьць, што затрымлівае тэрміны здачы аб'ектаў. Вельмі часта на будоўлю паступаюць і некамплектныя матар'ялы; калі будканторам жадае іх перакінуць з аднаго будаўніцтва на другое з тым, каб на абодвух атрымаліся поўныя камплекты і можна было-б бесьперабойна праводзіць работу, работадаўца, з прычыны таго, што ён плаціць грошы за матар'ял, гэтага не дазваляе, што зрывае нармальны ход работы. Пры такой сыстэме нельга наладзіць правільнага ўліку будматар'ялаў. Да гэтага часу ніхто нішчо ня ведае, якія матар'ялы, колькі і куды дастаўлены ў першыя два месяцы гэтага году.

Вопыт будаўніцтва 1931 г. паказаў, што будаўнічыя механізмы, у выніку няўменьня і нежаданьня будаўнічых арганізацый, скарыстоўваліся ўсяго на 10-30 проц., што павялічвала запатрабаваньні ў дадатковай рабочай сіле. Былі выпадкі, калі пры поўнай насычанасьці пабудовы мэханізмамі вытворцы работ імкнуліся захаваць надлішную рабочую сілу замест таго, каб перакінуць яе на тыя аб'екты, дзе не хапала рабочых рук. Рабочая сіла часта скарыстоўвалася нерацыянальна. Напрыклад, дошку замест 2-4 чалавек насілі 8-10, бальку замест 6-8 насілі 16-20. Значна паніжала прадукцыйнасьць працы і пачасовая аплата 25-35 проц. рабочых. Гэта трэба ўлічыць зараз, каб не паўтараць памылак мінулага году.

У забесьпячэньні рабочых будаўнікоў зараз ёсьць непармальнасьці, якія спрыяюць цякучасьці рабочай сілы. Так, будаўніцтву дому ўраду, дзе занята 1.000 рабочых, Менскі гарсняб даў толькі 470 пайкоў; а пабудове Магілеўскага трубаліцейнага заводу, дзе занята 450 рабочых, адпускаецца 50 пайкоў.

У 1932 г. у БССР павінна быць выраблена 335-350 млн. цаглін, з іх па рэспубліканскай прамысловасьці — 95 млн. штук, па мясцовай—135 млн. і па саматужнай—105 млн. штук.

Саматужная прамысловасьць, у параўнаньні з рэспубліканскай і мясцовай, у гэтых адносінах знаходзіцца ў лепшым становішчы таму, што прамсаюз выпрацоўвае тонты сам, мае свае зясныя распрацоўкі і сыркарнакавальскія майстэрні, а рэспубліканская і мясцовая прамысловасьць атрымліваюць усе матар'ялы праз Дзяржплян і Белдзяржснаб, а ліцьцём і запаснымі часткамі забясьпечваюцца праз рэспубліканскія заводы і фабрыкі, якія да гэтага часу яшчэ невыстарчальна абслугоўваюць прамысловасьць будматар'ялаў.

Падрыхтоўка да вырабу будматар'ялаў праходзіла гэтай зімой недавальняюча. Заводы вельмі мала зрабілі для забесьпячэньня выпуску прадукцыі. Так, напрыклад, гомельскі завод № 6 павінен быў даваць цэглу з 1 сакавіка, а зараз гэты тэрмін адкладзен на 1 красавіка і выкананьне яго не забясьпечана.

Будаб'яднаньне намячае пабудаваць у гэтым годзе 15 заводаў па вырабе буйна-блёчных каменьняў, што замяніць 16 млн. цаглін. Такія заводы пабудаваны ўжо ў Менску і ў Гомелі і ў бліжэйшыя дні ўступаюць у эксплёатацыю. Пабудова іншых яшчэ ня скончана.

Усе факты, прыведзеныя намі, гавораць аб тым, што ў першыя два месяцы г. г. зроблена вельмі мала для забесьпячэньня пасьпяховага разгортваньня будаўніцтва. Каб выкаваць плян, неабходна зараз-жа арганізаваць апаратыўны будаўнічы орган, які-б зацьвярджаў пляны будкантор, разьмяркоўваў паміж імі матар'ялы і меў права манэўраваць матар'ялямі па камплектах.

Важнасьць аб'ектаў павінна быць цесна сувязана з тэрмінамі атрыманьня абсталяваньня. **Заводы па вырабе будматар'ялаў павінны быць у першую чаргу забясьпечаны неабходнымі матар'ялямі і апаламі.** У тых аб'ектаў, якія да гэтага часу ня маюць праектаў і каштарысаў будаўніцтва, павінны быць адабраны матар'яльныя сродкі і перададзены тым аб'ектам, дзе іх не хапае. Адпаведна з каляндарным планам работ павінны быць устаноўлены і адкрыты крэдыты. Усе фонды на матар'ялах трэба перадаць будканторам для рэалізацыі, павінуўшы за Белдзяржснабам толькі неграмоздкія матар'ялы.

Конкурс спаранных брыгад

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЯРШЫНСТВА

Падцягнуць адсталыя вучасткі

Сёньня мы зьмяшчаем першыя вынікі работы да 15 сакавіка 32 паравозаў — удзельнікаў 2-га ўсебеларускага імя XIV зьезду КП(б)Б конкурсу спараных брыгад. Па віне райжуры, якія з вялікім спазьненьнем прыслалі весткі, затрымалася абвешчаньне вынікаў за 15 дзён. Цэнтральнае журы, паказваючы на недапушчальнасьць паўтарэньня такіх фактаў, патрабуе, каб весткі за другую палову сакавіка былі дасланы не пазьней 2 красавіка.

Якія вынікі спаборніцтва 32 паравозаў на 15 сакавіка?

Ва ўпартай барацьбе за першынства 24 паравозы перавыканалі асноўныя паказальнікі, вызначаныя ва ўмовах конкурсу. Імі зроблена 9.806 клм. перапрабегу. 25 паравозамі з'эканомлена 131,98 тоны апалу. 16 паравозамі з'эканомлена 793,2 кгр. змазкі. Усімі паравозамі, апрача аднаго Щ-482 (мае 64 мінуты спазьненьня) зроблена нагону ў дарозе 77 гадз. 57 мінут.

ОВ-6365 і СУ-9875 выбылі з ліку ўдзельнікаў конкурсу. Першы за зрыў спаранай, другі — за выплаўку падышыпнікаў. У адносінах ОВ-6365 цэнтральнае журы больш дакладна правярае, па чыёй віне быў зрыў. Калі выявіцца, што не па віне брыгады, тады паравоз зноў будзе ўключан у лік удзельнікаў конкурсу. Задача гэтых брыгад — праводзіць далей барацьбу за высокія паказальнікі ўпартай работы, выкупіць дапушчаныя дэфэкты.

6 паравозаў трапілі ў лік адсталых, як навыканаўшыя асноўных паказальнікаў. Яны маюць 19,54 тоны перапалу, 16 паравозаў маюць 316 кгр. перарасходу змазкі. Аднак, паравозныя брыгады гэтых паравозаў маюць усе магчымасьці, каб на працягу бліжэйшага часу ліквідаваць сваё адставаньне і выйсьці на перадавыя месцы ў конкурсе.

Трэба адзначыць, як на зусім недавальняючае зьявішча, што лік гадзін, у які выконваўся паравозамі агульны прабег за 15 дзён, праз меру высокі. Асабліва гэта датычыць віцебскага дэпо.

Аб чым гэта сьведчыць? Раней за ўсё аб дрэнным скарыстаньні брыгад, аб адсутнасьці выразнага графіку работы, выразнай сыстэмы выклікаў брыгад. У Віцебску, напрыклад, былі факты, калі брыгады выклікаліся за 5-8 гадзін раней, чым трэба было выязджаць пад нагнік. З гэтым трэба навесьці рашучую барацьбу.

Першыя вынікі спаборніцтва паказваюць, таксама, што рад паравозаў яшчэ не дабіліся эканоміі апалу і асабліва змазкі. Увага брыгад павінна быць зьвернута на падцягненьне адсталых вучасткаў работы.

Узмацняючы палітычна-масавую работу сярод паравозных брыгад, набальшавікі рэалізуючы 6 умоў т. Сталіна, пашыраючы вопыт лепшых, партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны забясьпечыць павышэньне тэмпаў і якасьці барацьбы спараных брыгад конкурсных паравозаў за першынства, усёй масы чыгуначнікаў—за выкананьне трансфінпляну.

Работа паравозаў з 1 па 15 сакавіка, якія прымаюць удзел у другім усебеларускім конкурсе імя XIV зьезду КП(б)Б

ТАВАРНЫЯ

Месца, якое займае брыгада		Агульны лік балаў	Месца, якое займае брыгада		Агульны лік балаў
1.	Щ-373. Цыльке, Жаўнерчык (дэпо Менск).	427	10.	Щ-419|2. Рачко, Авялёнак (дэпо Віцебск)	94,2
2.	ОВ-6016. Купрэеў, Хмялеўскі (дэпо Менск).	389,1	11.	Э-44. Дашкоў, Анохін (дэпо Віцебск) . .	83
3.	Щ-22. Рыжанскі, Дакукін (дэпо Ворша) .	353,7	12.	ОВ-7259. Пазьняк, Крапан (дэпо Полацак)	79
4.	ОЧ-6761. Сенічаў, Грышчанка (дэпо Гомель)	351,6	13.	Щ-323. Янушэўскі, Станыліс (дэпо Ворша) .	64,9
5.	ОЧ-2 Прастаноў, Леановіч (дэпо Гомель).	317	14.	ОВ-5137. Урбановіч, Алёкса (дэпо Асіпавічы)	56,37
6.	Щ-1687. Вігдорчык, Сенажэнскі (дэпо Жлобін)	315,14	15.	Щ-348. Дораш, Антонаў (дэпо Магілеў) .	50,9
7.	Щ-1689. Зялёнка, Хохаў (дэпо Жлобін) .	180,97	16.	Щ-647. Кальцоў, Конюхаў (дэпо Віцебск) .	43,6
8.	Э-91, Кулеш, Шчарбакоў (дэпо Віцебск) .	130,1	17.	Щ-2076. Дразлоў, Марозаў (дэпо Жлобін)	43,41
9.	Щ-2055. Нічык, Саколік (дэпо Гомель) .	116,4	18.	Щ-557. Аднаблюдаў, Стацко (дэпо Жлобін)	6,24

ПАСАЖЫРСКІЯ

1.	СУ-9769. Мікуловіч, Гускін (дэпо Ворша)	283,9	4.	С-12. Ветраў, Бялько (дэпо Віцебск) . .	92,8
2.	С-56. Шпакоўскі, Паліцан (дэпо Віцебск) .	222,1	5.	С-303|2. Бародзін, Самадум (дэпо Гомель)	84,4
3.	С-112. Дзянісаў, Шульга (дэпо Гомель) . .	99,8	6.	СУ-9787. Ветраў, Касько (дэпо Менск) . .	68,4

Адстаючыя паравозы

Выбылі з спаборніцтва

1. Паравоз ОВ-6365, брыгады **Пярніцкага і Саламатнікава** (дэпо Асіпавічы) па ліку балаў (плюс 317,87) заняў трэцяе месца сярод конкурсных **таварных** паравозаў. Аднак, за час конкурсу брыгада мела адзін зрыў спаранай і таму, паводле ўмоў конкурсу, выбывае з ліку ўдзельнікаў усебеларускага конкурсу. Цэнтральнае журы зараз дакладна высьвятліць прычыны гэтага зрыву.

2. Паравоз СУ - 9875, брыгады **Баранава і Крысацкага** (дэпо Ворша) па ліку балаў (плюс 153,2) заняў трэцяе месца сярод конкурсных **пасажырскіх** паравозаў, але, з прычыны таго, што па віне брыгады быў адзін выпадак выплаўкі падшыпніка, паводле ўмоў конкурсу таксама выбывае з ліку ўдзельнікаў усебеларускага конкурсу.

Ня выканалі асноўных паказальнікаў

1. Паравоз Щ - 5089, брыгады **Ташкова і Руцэвіча,** — дэпо Жлобін (мінус 316,71 балаў).

2 Паравоз ОВ - 1542, брыгады **Шчэрба і Дарашкевіча** — дэпо Полацак (мінус 252 балы.)

3. Паравоз ОВ - 7587, брыгады **Яворскага і Наваграл**—дэпо Калінковічы (мінус 167,7 балы.)

4. Паравоз Щ - 482, брыгады **Мармулеўскага і Хадкевіча,** — дэпо Магілеў (мінус 84,4.)

5. Паравоз Щ - 4534, брыгады **Шчагалькова і Лунёва** — дэпо Гомель (мінус 36 балаў).

Як мы прымусілі паравоз лепш працаваць

Наша спараная брыгада атрымала паравоз С-331 у надзвычай дрэнным стане. З першых-жа дзён працы на ім выявіўся перапал. Мы пачалі вынаходзіць прычыны гэтага. Пытаньне было абгаворана на вытворчай нарадзе нашай брыгады. Пасьля дэтальнага абмеркаваньня і ўзгадненьня з адміністрацыяй, мы паранашлі зрэзаць шайбы залатнікоў Трафімава на 3 міліметры. Пасьля гэтага машына адразу пачала лепш працаваць.

Адначасова мы пачалі высьвятляць прычыны, чаму дрэнна трымаецца вада ў машыне. Брыгады рашылі прасіць адміністрацыю падняць суханарны калпак у часе прамыўкі. Просьба была выканана. Паставілі яшчэ адну сетку. У выніку машына стала лепш трымаць ваду.

Паказаныя мерапрыемствы далі нам магчымасьць на толькі ліквідаваць перапал, але нават за першую дэкаду сакавіка дабіцца эканоміі апалу на 13.5 проц. Гэта спрыяла яшчэ большаму ажыўленьню работы брыгад па аздараўленьні паравозу. На вытворчай нарадзе брыгады пастанавілі дабіцца эканоміі апалу на 20 проц. Брыгады прысутнічаюць на ўсіх прамыўках, а таксама выконваюць дробны рамонт. Пры прыезьдзе з дарогі брыгады сустракаюцца і абмяркоўваюць усе недахопы, якія выяўлены ў часе язды. Наш паравоз — удзельнік дарожнага конкурсу.

У апошні час мы дабіліся раду дасягненьняў. Праз упартую працу, над паляпшэньнем работы паравоза мы зусім зьнічылі спазьненьні. За першую палову сакавіка маем 10.5 проц. эканоміі апалу, 36,4 проц. — эканоміі змазкі, ніводнага зрыву спаранай і г. д. Але гэтыя посьпехі толькі першыя. Мы аблічаем яшчэ больш намагчы сілы, каб заваяваць новыя посьпехі ў работе.

Спараная брыгада паравоза С-331 КАНДЫБА, МАЦКЕВІЧ (машыністы); ШЫШЫН і БАРАНАЎ (пам. машыністаў); ЯРУШКОЎСКІ і КАВАЛЁЎ (качагары).

ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ

СУПРОЦЬ СКАЖЭНЬНЯЎ І БЛЫТАНІНЫ

У газэце «Рабочий» у нумары ад 29 сакавіка апублікована перадавы артыкул «За ленінскую нацыянальную палітыку». Гэты артыкул мае ў сабе такую колькасьць блытаных і скажаючых устаноўкі партыі фармулёвак па пытаньні аб барацьбе з ухілам, што яго прызнаць партыйным ніяк нельга.

Разгледзім дзьве фразы. У перадавой напісана:

«Для сучаснага этапу барацьбы клясавых ворожых элементаў супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі характэрным зьяўляецца тое, ШТО УСЕ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ СІЛЫ АРГАНІЗУЮЦЦА ПАД ЧОРНЫМ СЬЦЯГАМ ВЯЛІКАРАСІЙСКА-ШАВІНІСТЫЧНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ І КУЛАЦТВА СУПРОЦЬ РУСКІХ, БАШКІРСКІХ, ТАТАРСКІХ, БЕЛАРУСКІХ, УКРАІНСКІХ, ПОЛЬСКІХ, ЯЎРЭЙСКІХ І Г. Д. РАБОЧЫХ І СЯЛЯН, СУПРОЦЬ САЦЫЯЛІЗМУ. Тут партыйныя арганізацыі БССР павінны быць асабліва пільнымі, бязьлітасна выкрываючы вялікадзяржаўны ўхіл, ЯК ГАЛОЎНУЮ НЕБЯСЬПЕКУ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ, вырываючы з карэньнем рэшткі контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і антысэмітызму, вядучы адначасова і барацьбу з прымірэнцтвам да гэтых ухілаў».

І так аўтар перадавой устаўляе, што «**ўсе контр-рэвалюцыйныя сілы арганізуюцца пад чорным сьцягам вялікарасійска-шавіністычнай інтэлігенцыі і кулацтва**» (усе падкрэсьленьні зроблены аўтарам перадавой і самой рэдакцыяй «Рабочего»). У сякаму ўважлівому нашаму чытачу ясна, што рэдакцыя газ. «Рабочий» зрабіла тут недапушчальную «перадержку». Ніколі наша партыя, у адрозьненьне ад аўтара перадавой, не сьцьвярджала, што ўсе контр-рэвалюцыйныя сілы арганізуюцца вакол вялікарасійскага шавінізму. Ці ня зьнімае рэдакцыя «Рабочего» такой фармулёўкай пытаньня аб небясьпецы **беларускага контр-рэвалюцыйнага нацдэмакратызму, украінскага нацдэмакратызму** і г. д.? Бязумоўна, **зьнімае. Бо калі ўсе сілы** арганізуюцца пад чорным сьцягам вялікарасійскага шавінізму, то не застаецца ўжо сіл, не застаецца ўжо небясьпекі беларускага кулацтва, беларускай контр-рэвалюцыйнай нацдэмакратычнай інтэлігенцыі і г. д. Адсюль ясна, што фармулёўка перадавой рэдакцыі «Рабочего» дэзарыентуе, перашкаджае разумець адэкватна правільную палітыку нашай партыі, якая заключаецца ў рэальным уліку небясьпекі як вялікарасійскага шавінізму, так і беларускага, украінскага і г. д., якая заключаецца ў мабілізацыі рабочай клясы на барацьбу з усёй контр-рэвалюцыяй, што мае ў розных сваіх частках ня толькі вялікарасійска-шавіністычную афарбоўку, але і беларуска-шавіністычную, украінска - шавіністычную і г. д.

Так стаіць справа з першай фразай гэтай вытрымкі. Разгледзім другую. Паводле сэнсу другой фразы можна зрабіць вывад, што «рэшткі (?) контр-рэвалюцыйнага нацдэмакратызму і антысэмітызму» зьяўляюцца ўхілам зь лініі партыі. Ці ня ясна, што гэта бязглуздзіца, якая вынікае або з нізьвіненнасьці, або з абсалютна недапушчальных, вялізных адносін да ўласных вісаньняў.

Трэба сказаць, што ўтоесамленьне ухілаў ад нацыянальнай палітыкі партыі ў бок шавінізму і нацыяналізму з вялікадзяржаўным чорнасоценным шавінізмам, з антысэмітызмам і контр-рэвалюцыйным нацдэмакратызмам мае месца і ў другіх абзацах. Так, з другога абзацу мы, напрыклад, дазнаемся, што ня ўхіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму зьяўляецца галоўнай небясьпекай у партыі, а вялікадзяржаўны шавінізм насуп. Ва ўсім артыкуле не знайсьці ні аднаго слова аб ухіле ў бок беларускага шавінізму, хаця з тэксту можна зрабіць часам заключэньне, што аўтар перадавой аперуе такім паняцьцем, як ухіл у бок контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму. З усяго відаць, што аўтар перадавой вінавочна ставіць знак роўнасьці паміж беларускім шавінізмам і нацдэмакратызмам (да ночы, паводле аўтара перадавой, існуюць толькі «рэшткі» яго). Гэта прыправільна, бо формы праяўленьня беларускага шавінізму ня вычэрпваюцца праяўленьнямі, праўда, найбольш пашыранага, нацдэмакратызму. З гэтага вынікае, што і ўхіл у бок беларускага шавінізму можа мець **розныя формы праяўленьня.**

Мы мяркуем, што няма сэнсу прыводзіць другія прыправільныя і бязглузыя фармулёўкі, што і сказана даволі для таго, каб бачыць, наколькі **нясур'ёзна** падышла рэдакцыя «Рабочего» пры зьмяшэньні гэтага шкоднага артыкулу, ды яшчэ ў якасьці перадавой.

Пяцідзеньнік бюро скаргаў РСІ

20 ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МЕНСКУ УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў АГЛЯД

Разгортваецца масавая работа

У пяцідзеньнік агляду работы бюро скаргаў РСІ ўключыліся 20 прадпрыемстваў гор. Менску. Мабілізаваны актыў грамадзкіх інструктароў бюро скаргаў, лёгкай кавалерыі, якія паеланы непасрэдна на прадпрыемствы для разгортваньня работы на пяцідзеньніку.

На мясцох арганізуюцца брыгады, выпускаюцца штодзенкі. На такіх прадпрыемствах, як фабрыка «Кастрычнік», імя Крупскай, «8-га сакавіка» і інш., прыступілі да справаздачы бюро скаргаў.

В.

Ударніцы фінфронту будуць ударніцамі і на аглядзе бюро скаргаў

25 сакавіка ў клюбе гарсавету адбыўся зьлёт ударніц фінансавага фронту Менскага раёну, на якім зроблена інфармацыя па правядзеньні пяцідзеньнікаў агляду работы бюро скаргаў.

Ударніцы пастанавілі: прыняць актыўны ўдзел ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце, праводзіць праверку пад знакам мабілізацыі пралетарскай грамадзкасьці на выкананьне і перавыкананьне заданьняў 4-га, заключнага году пяцігодкі.

Асабліва ўдарніцы выказаліся за ўцягненьне жанчын у работу бюро скаргаў РСІ. Зьлёт абвясьціў слабе ўдарным па правядзеньне гэтай работы і заклікае ўсіх жанчын фабрык і заводаў, сяўбасаў і калгасаў прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні пяцідзеньніка.

ХВЕДАР.

Фан Шы-мін

Здача Шанхаю і барацьба кітайскага пралетарыяту

Хутка мінае месяц, як здан Шанхай. Здача Шанхаю — выніх пацёку 60.000 японскай арміі і чорнай здрады гаміндану.

Японскія разбойнікі прабавалі ў пачатку сваёй экспедыцыі, новымі сіламі ўдарыць Шанхай фронтавай атакай — пралічыліся. Патрабавалася перакідка ў Шанхай 60.000 салдат і матросаў, больш 200 гармат, паловы ўсяго паветранага флёту, 50 браняносцаў і крэйсэраў; патрабавалася больш месяца крывапралітнай барацьбы і ўдар у сьпіну абаронцам Шанхаю з боку гаміндану, каб вырашыць задачу захвату Шанхаю. Фронтавая атака на Чапэй павінна была быць дапоўнена пасупыннай атакай на флянгах, абыходным рухам, высадкай десанту ў тыле, разбурэньнем камунікацыйных ліній. Уся барацьба за Шанхай суправаджалася з боку японскіх разбойнікаў масавым тэрорам, гвалтам і забойствам мірнага насельніцтва, жанчын і дзяцей, марадзёрствам японскіх салдат, матросаў і іх шанхайскіх рэзервістаў.

Барацьба за Шанхай паказала ўсю прадажнасьць, усю трусьлівасьць, усё здрадніцтва нацыянальных інтарэсаў гаміндаму і кітайскай буржуазіі. У той-жа час абарона Шанхаю сал дацкімі і рабочымі масамі, зьяўляецца рэвалюцыйна - гістарычным фактам.

У барацьбе за Шанхай у нацыянальна - рэвалюцыйнай вайне, якая разьвіваецца супроць японскага імпэрыялізму, кітайскі пралетарыят іграе выключна вялікую ролю. У гэтай барацьбе за незалежнасьць краіны, супроць яе падзелу імпэрыялістамі, пралетарыят зварачаецца да самых рэшаючых форм барацьбы, пачынаючы ад забастовак і канчаючы ўзброенай барацьбой.

Гэнеральная здача Манчжурыі японскім імпэрыялістам з боку Чжан Сюэляна выклікае развал у яго арміі. Пасобныя салдацкія часьці пачынаюць весьці партызанскую вайну супроць акупантаў. У гэтыя часьці ўлізваюцца рабочыя Мукдэну, Кайланскіх капалень, чыгуначнікі Байпіп—Мукдэнскай чыгункі. Характэрна, што найбольш моцны партызанскі рух у Манчжурыі знаходзіцца ў раёне Цзынь-сі, дзе ёсьць вугальныя капальні. Амаль усе рабочыя гэтых капалень уліліся ў розных роду партызанскія атрады. Гэтыя партызанскія атрады нядаўна зьнішчылі цэлы японскі полк з камандзірам Кага на чале. Японскае камандаваньне прымушана перакінуць у гэты раён «для ўціхамірваньня бандытаў» цэлую брыгаду. Партызанскія атрады ўсё растуць. У іх рады ўлізваюцца сялянскія масы. Нацыянальна-рэвалюцыйная вайна ў Манчжурыі толькі пачынае разьвівацца. «Нацыфікацыя» манчжурскіх вёсак, якая праводзіцца захватчыкамі, тэрор, гвалт, пачатак выкачваньня падаткаў з сялянства, а ў падалёкім будучым— захват зямель, якія належаць манчжурскім сялянам, прыводзе да пашырэньня і абвастрэньня гэтай вайны.

Але асабліва месца ў разьвіцьці нацыянальна-рэвалюцыйнай барацьбы займае авангард кітайскай рабочай клясы — шанхайскі пралетарыят.

У кастрычніку кампартыя кітае лёзунг узбраеньня рабочых. У адказ на гэта рабочыя масы пачынаюць стыхійна ўзбройвацца, захапляючы зброю, разбройваючы паліцыю.

Адначасова па японскіх прадпрыемствах пракатваецца хваля за хваляй стачкі. 65.000 кітайскіх рабочых Шанхаю, занятых на японскіх прадпрыемствах, бастуюць бесьперапынна. Японскія прадпрыемствы закрываюцца, магазыны пустуюць, параходы не нагружаюцца і не разгружаюцца.

У пачатку студзеня кампартыя і чырвоныя прафсаюзы кідаюць лёзунг усеагульнай антыімпэрыялістычнай забастоўкі. На фабрыках, заводах, майстэрнях ідзе абгаворваньне і агітацыя за ўсеагульную стачку. Напружаньне ў Шанхаі ўзрастае, калі японская, англійская, амэрыканская, французская і гаміндапаўская паліцыя прабуе масавым тэрорам і гвалтам паклясьці канец антыімпэрыялістычнаму руху. Японская ваенщчына выразнае прыступіць антыімпэрыялістычны і байкатыцкі рух сілай зброі і тэрору. Гаміндапаўскім уладам прад'яўляецца ультыматум аб спыненьні байкоту і антыяпонскага руху. Бесьперапыннае прасоўваньне японскіх вайсковых часьцей у Чапэй, а таксама гвалт і марадзёрства, якія ўчыняюць японскія розэрвісты, выклікаюць вы бух абурэньня і пачатак партызанскай барацьбы рабочых, гарадзкой беднаты і часткі студэнцтва. Чапэй пакрываецца сеткай імправізаваных барыкад. Японскія салдаты і матросы, якія прасоўваюцца наперад, выбіваюцца з занятых раёнаў і выкідваюцца па тэрыторыю міжнароднага сэтльмэнту.

Чапэй, Хусі, Напьдао і іншыя раёны кітайскага Шанхаю бурляць. Сьцены дамоў, магазынаў, усе вулічы пакрыты лёзунгамі, якія выражаюць надзеі і патрабаваньні народных мас. Найбольш распаўсюджанымі лёзунгамі зьяўляюцца: «Нахай жыве ўсеагульная забастоўка рабочых, вучняў, ганцляроў. Далоў японскі імпэрыялізм, далоў гаміндан, які працае нацыянальным інтарэсы і знаходзіцца ў блёку з імпэрыялістамі. Масы! Узбройвайцеся самастойна для таго, каб вынаць японскіх імпэрыялістаў. Рабочыя, сяляне, салдаты і ўсе працоўныя! Злучайцеся для зьвяржэньня гаміндапаўскага ўраду. Стварайце камітэты абароны».

У рабочых кварталах гэтыя лёзунгі дапаўняюцца прыватнымі кітайскай Чырвонай арміі, савецкаму Кітаю і правадыру працоўных мас — кітайскай кампартыі.

Рух мас, пачынаючы да гвалтаўнікоў, энтузіязм, поплахісная воля да абароны Шанхаю—захапляюць і салдацкія масы. Барацьба, пачатая рабочымі атрадамі супроць японскіх матросаў, якія бесьперашкодна прасоўваюцца ў Чапэй, падхапляецца салдатамі 19 арміі. Барацьба і рух салдат захапляюць малодшы і сярэдні камандны склад. У той час, як рабочыя і салдаты б'юцца з акупантамі за Паўночны вакзал, камандзір 19 арміі Цай-Цін-кай вядзе перагаворы аб «мірным улажэньні канфлікту» і адступленьні. Весткі аб гэтых перагаворах выклікаюць выбух абурэньня ў салдацкай масе і ніжэйшым камандаваньні.

У пачатку акупацыі Шанхаю, кампартыя і Шанхайская рада прафсаюзаў разьвіваюць энергічную работу па падрыхтоўцы і арганізацыі ўсеагульнай антыімпэрыялістычнай стачкі. Правядзіцца рад мітынгаў і делегацкіх сходаў па прадпрыемствах і раёнах. 29 і 30 адбываюцца сходы прадстаўнікоў фабрык і заводаў. На гэтых сходах з пачатку выбіраецца аб'яднаны стачком усіх тэкстыльных прадпрыемстваў Хусі (Заходні раён Шанхаю), а потым усешанхайскі стачком. Генэральны стачачны камітэт разам з прадстаўнікамі больш як 80 прадпрыемстваў выпрацоўвае праграму барацьбы, апублікаваную ў Фынь-жы-Мін-Чжуань. Вось найбольш характэрныя вытрымкі з яе:

«Неабходна ўзброіць масы, выгнаць японскія і іншыя імпэрыялістычныя морскія, паветраныя і сухаземныя войскі з Кітаю, самастойна скасаваць усе прывілеі імпэрыялістаў у Кітаі.

Узброеныя масы скідаюць гаміндапаўскі ўрад, які працае кітайскі народ і капітулюе перад імпэрыялістамі, і арганізуюць уласны масавы ўрад для вядзеньня рэвалюцыйнай нацыянальнай барацьбы.

Неабходна сьпінчыць усе азвольныя законы і загады, якія прыгнятаюць рабочых, і ўвесьці ў дзейнасьць забачае заканадаўства, якое ахоўвае рабочых. Неабходна ўстанавіць поўную свабоду слова, сходаў, арганізацый, друку, забастовак. Неабходна вызваліць усіх арыштаваных рабочых і адкрыць усе апячатаныя рабочыя саюзы.

Дарослыя рабочыя павінны працаваць штоденна не больш 8 гадзін. Падросткі — маладзей 18 год, штоденна павінны працаваць 6 гадзін. Падросткі маладзей 14 год павінны працаваць у дзень на больш 4 гадзін. Нельга падаўжаць рабочы дзень без аплаты прафсаюзаў і фабрычна - заводзкага камітэту і без спэцыяльнай за гэта аплаты».

«Рабочыя не павінны працаваць 4 дні ў месяц (нядзелі) і ўсе рэвалюцыйныя сьвяты. За ўсе гэтыя дні заработная плата павінна быць выплачана. Рабочы павінен штогод карыстацца водпускам з захаваньнем пэнсіі на працягу прынамсі двух тыдняў. Калі-ж ён працуе — за час водпуску яму павінна быць выдана зарплата ў падвойным разьмеры. У канцы кожнага году месячная зарплата рабочага павінна быць выдана ў падвойным разьмеры.

У выпадку, калі рабочы паранен ці захварэў, гаспадар выдае сродкі на лекарствы і няўтрымлівае нічога з зарплаты. У выпадку, калі рабочы ў выніку параненьня ці прафэсіянальнай хваробы, становіцца калекай ці проста стары, гаспадар павінен да канца яго жыцьця выдаваць яму поўны месячны аклад. Жанчына - работніца атрымлівае 4-х месячны водпуск з захаваньнем зарплаты.

У выпадку спыненьня работы на фабрыцы ці звальненьня работнікаў наогул, рабочым трэба выдаваць выхадную дапамогу ў разьмеры 6-ці месячнай заработнай платы. Звальненьне рабочых фабрыкай можа быць толькі па згодзе прафсаюзу і фабрычна-заводзкага камітэту.

Мы патрабуем, каб гарадзкі ўрады арсэнал і ўсе вайсковыя арганізацыі выдалі зброю для рабочых пікетаў і валёнтэрскіх атрадаў самаабароны.

Стачэчны камітэт усеагульнай антыяпонскай стачкі ў Шанхаі».

Гэта праграма патрабаваньняў шанхайскага пралетарыяту была выпрацавана генэральнымі стачкомам з удзелам рабочых ад многіх дзесяткаў фабрык і заводаў. Ня гледзячы на тое, што камуністаў была меншасьць, а «рэарганізацыяністы і чэндусюісты разьвілі шалёную кампанію пад агульнымі лёзунгамі абароны, вайны супроць японцаў і агульных свабод, шанхайскія пралетары прынялі такую праграму барацьбы, якая злучае барацьбу кітайскага пралетарыяту супроць інтэрвэнцыі і падзелу Кітаю з барацьбой супроць гаміндану і ўраду нацыянальнай здрады і ганьбы і барацьбой за непасрэдныя эканамічныя і палітычныя патрабаваньні рабочай клясы.

Пад канец дня 30 студзеня, па заклику генэральнага стачкому, баставала каля 40 прадпрыемстваў. 31 далучылася да стачкі яшчэ некалькі дзесяткаў. 1-га лютага баставалі рабочыя амаль усіх прадпрыемстваў Хусі і Чапэю. У наступныя дні бастуе частка рабочых у Напьдао. Забастовачны рух часткова перакідаецца на міжнародны сэтльмэнт і французкую канцэсію.

Усяго забаставала ў Шанхаі за час ад канца студзеня да здачы Ш

Аб падрыхтоўцы да будаўніцтва па прамысловасьці і камунальнай гаспадарцы на 1932 г.

Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму Менаркому і гарКК КП(б)Б ад 19-20 сакавіка

Заслухаўшы даклады Будаб'яднання і фр. Гарсавету аб ходзе падрыхтоўчых работ да разгортвання прамысловага і камунальнага будаўніцтва на 1932 г., аб'яднаны Пленум Менаркому і Гар. КК КП(б)Б знаходзіць ход падрыхтоўчых работ да будаўніцтва 1932 г. незадавальняючым.

Асноўнымі недахопамі падрыхтоўчых работ зьяўляюцца:

1. Адсутнасьць да гэтага часу зацверджаных дырэктыўнымі органамі пляну і чарговасьці работ.

2. Зусім незадавальняючая падрыхтоўка бударганізацый да арганізацыі работ на будаўнічых вучастках. Да гэтага часу самімі будаўнічымі і будаўнічымі арганізацыямі не выраблен цэлы рад пытаньняў, ад якіх залежыць пасьпяховае правядзеньне будаўніцтва (адсутнасьць праектаў, чарцяжоў, разрыў паміж плянам капітальнага будаўніцтва і фінансаваньнем, адсутнасьць вучастка, да гэтага часу не заключаны ўмовы).

3. Зусім незадавальняючая падрыхтоўка прамысловасьці будматар'ялаў да разгортвання вытворчасьці.

4. Незадавальняючая работа органаў НКПрацы і бударганізацый у справе вярбоўкі рабочай сілы для будаўніцтва (позняя выдача нарадаў і нерэальнасьць іх у радзе выпадкаў, зусім слабая актыўнасьць бударганізацый у справе вярбоўкі, незадавальняючы вярбовачны апарат), з прычыны чаго плян вярбоўкі рабочай сілы выкананы на 20-25%.

5. Дрэнная падрыхтоўка да забесьпячэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых — падрыхтоўка інтэрнатаў, сталеварні, арцянай вярабіла. Яны ... раз аб будаўніцтва ... трэба.

У студзені ... будаўніцтва ... Гомелі ... — ... будаўніцтва, але ... Менску праектар. Пленум ... ЦЕМА:

1. Зацверджаць абём капітальнага будаўніцтва на прамысловасьці і гарадзкой гаспадарцы ў 40.065 тыс. руб. (арыентоўна).

Аб'ектамі першай чаргі лічыць:

а) па прамысловасьці ВСНГБ—Дом Друку, механічны цэх на з-дзе «Камунар» і капельны цэх на з-дзе імя Вацлава.

б) Па мясовай прамысловасьці — кліперны завод, рэканструкцыя 3 капельных заводаў.

в) На прамысловасьці будматар'ялаў — фэбрэлітавы завод, пабудова сушыльняў па капельных заводах і завод стандартных дамоў.

г) На камунальным будаўніцтве — пракладка новай трамвайнай лініі па Ляхаўку, помпавая станцыя, каналізацыя 500 кватэр, брукаваньне 150 тыс. кв. мэтраў вуліц, масты.

д) На сацыяльна-бытавых установах — фабрыка-кухня, 2 лазьні, пральня, сталоўка, фабрыкі «Акцябр».

е) Пабудова цэпла-электра-цэнтралі.

ж) На жыльлёвым будаўніцтве:

1) Зацвердзіць план жыльлёвага будаўніцтва па г. Менску на 1932 г. у 2 тыс кватэр (у тым ліку па лініі Гарсавету — 612 кватэр, па лініі жыльлёвага, каапераціві і прамысловасьці — 366 кватэр, астатнія 522 кватэры па лініі асобных ведамстваў.

2) З вызначаных па лініі Гарсавету 612 кватэр пабудаваць — 406 кватэр драўляных, стандартнага тыпу, астатнія 206 кватэр каменныя за лік падбудовы паверхаў.

Усю астатнюю жыльлёвую будаваць выключна за лік даноў дрэўляных стандартнага тыпу.

3) Устанавіць наступныя тэрміны скончэньня жыльлёвага будаўніцтва:

а) Да 1-га ліпеня — 50 проц. агульнай колькасьці кватэр, якая прадугледжана планам;

б) да 1-га кастрычніка — 25 проц. кватэр;

в) да 1-га студзеня 1933 г. — 25 проц. кватэр.

Пленум даручае Бюро Гаркому пры канчатковым абгаворэньні пляну будаўніцтва ў дырэктыўных органах дабіцца абавязковага ўключэньня вышэйпазначанага аб'ектаў у будаўніцтва першай чаргі. Забараніць усім будоўчым і будаўнічым арганізацыям унясэньні якіх бы там ні было змен і дадатковых аб'ектаў у будаўнічы плян без санкцыі Гаркому КП(б)Б.

2. Адзначаючы зусім незадавальняючую работу снабжаючых арганізацый (Белдзяржснаб, Стальбыт, Мэтызаб'яднаньне і інш.) у галіне снабжэньня будаўніцтва, Пленум Гаркому і Гар. КК КП(б)Б абавязвае снабжаючыя арганізацыі дабіцца бязумоўнага выкананьня плянаў снабжэньня будаўніцтва і поўнай рэалізацыі тых фондаў, якія вызначаны дырэктыўнымі органамі. Пленум лічыць неабходным перадачу фондаў і рэалізацыю фондаў асноўных будматар'ялаў (цэгла, цэмэнт, дахавыя матар'ялы, ванны, цьвікі, лес) непасрэдна бударганізацыям. Даручыць Бюро Гаркому паставіць гэта пытаньне перад ЦК КП(б)Б.

3. Пленум абавязвае бударганізацыі час, які застаўся, максымальна скарыстаць для арганізацыі падрыхтоўчых работ і забесьпячэньня поўнай гатоўнасьці для разгортвання будаўніцтва. Бударганізацыям развярстаць буфінплян па месячных і дэкадных планы, даводзячы плян да кожнай брыгады і рабочага. Бударганізацыям да 10 красавіка выправіць усе пытаньні, зьвязаныя з дагаворамі, кашторысамі, праектамі, чарцяжамі і г. д. Фр. Гарсавету не пазьней, чым да 1-га красавіка вызначыць усе вучасткі, на якіх павінны разгортвацца будаўнічыя работы. Прасьдыгуму Гар. КК праверыць выкананьне гэтага.

4. Пленум знаходзіць зусім незадавальняючым становішча падрыхтоўкі прамысловасьці будматар'ялаў да разгортваньня вытворчасьці. Пленум абавязвае аб'яднаньне будматар'ялаў і Менбуд разгарнуць самымі фарсаванымі тэмпамі падрыхтоўку заводу да пуску з тым, каб асноўныя падрыхтоўчыя работы: устаноўка сушылак, арганізацыя пад'язных шляхоў, пабудова сьцілажных і гамовачных ізветак былі скончаны не пазьней 15 красавіка.

Адзначаючы, што праграма цагельных заводаў можа быць цалкам выканана і перавыкананa, Пленум напаўджвае гаспадарчыя, партыйныя і праф. арганізацыі цагельных заводаў, што ўсіляклія спасылкі і апраўданьні свайго наўменьня працаваць усіляклімі аб'ектыўнымі прычынамі — будуць разглядацца як праяўленьне правага апартунізму на практыцы.

Пленум абавязвае партыйныя, прафесыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі цагельных заводаў дабіцца ў гэтым годзе канчатковага пералому ў справе пераводу работы цагельных заводаў на круглы год.

Адзначаючы незадавальняючае становішча гаспадарчых, партыйных і прафесыянальных кіруючых кадраў цагельных заводаў, Пленум даручае Бюро Гаркому правесьці ў дэкадны тэрмін мабілізацыю 15 членаў партыі на кіруючую работу на цагельных заводы.

5. Цэнтральнай задачай партыйных, гаспадарчых і прафесыянальных арганізацый будаўніцтва зьяўляецца барацьба за зьніжэньне сабекошту будаўніцтва і палепшэньне яго якасьці. Дырэктыва партыі аб зьніжэньні сабекошту на 17 проц. супроць фактычнага сабекошту мінулага году павінна быць на штодзень там ні стала выканана, шляхам: максымальнага скарачэньня тэрмінаў будаўніцтва, лепшай арганізацыі працы, лепшага скарыстаньня рабочай сілы, зьніжэньня адміністрацыйна - гаспадарчых выдаткаў, укараненьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і мэханізацыі, поўнага скарыстаньня шаўных мэханізмаў, рацыянальнага і эканомнага скарыстаньня матар'ялаў (асабліва мэталяў), мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Партыйным, гаспадарчым і прафесыянальным арганізацыям будаўніцтва зьвярнуць асаблівую ўвагу на палепшэньне якасьці выкананых работ, мабілізуючы навокал гэтай задачы шырокія масы рабочых будаўнікоў.

7. Пленум абавязвае бударганізацыі зараз-жа намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў будаўнікоў, шляхам пропуску іх праз спэцыяльныя курсы, перакваліфікацыі рабочых непасрэдна на будаўніцтве, палепшэньня работы Будвучу і г. д.

Абавязаць будаб'яднаньне і Гарком ЛКСМБ пераглядзець сыстэму падрыхтоўкі будаўнікоў праз Будвуч, арганізуючы падрыхтоўку тых кваліфікацый, у якіх адчуваецца патрэба на будаўніцтве.

9. Пленум Гаркому і Гар. КК знаходзіць абсалютна недапушчальнай работу НКПрацы і бударганізацый у галіне арганізаванага набору рабочай сілы (важнейшыя бударганізацыі да гэтага часу завербавалі мізэрны лік рабочых). Абавязаць НКПрацы і бударганізацыі ў 5-дзённы тэрмін выслаць у прымаўваньня раёны адказных работнікаў і неабходную колькасьць вярбоўшчыкаў з тым, каб разгарнуць работу на наборы і падрыхтоўцы рабочай сілы, правёўшы гэту работу, як масава-палітычную кампанію з тым, каб да 15-га красавіка поўнасьцю ўкамплектаваць будаўніцтва патрэбнай рабочай сілай.

9. Пленум Гаркому і Гар. КК лічыць абсалютна недапушчальным абыход усіляких норм і расцэнак, сыстэму падзённай і акордных аплаты працы, якая практыкавалася бударганізацыямі ў галіне аплаты працы ў мінулым годзе. Пленум абавязвае бударганізацыі ў палітычны зработнай платы цалкам і поўнасьцю выходзіць з устаноўленых норм і расцэнак і дырэктыў партыі на гэтым пытаньні, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на максымальнае ўкараненьне, неабмежаванай зьдольшчыны ва ўсіх зьвеньнях будаўніцтва.

10. Пленум Гаркому і Гар. КК адзначае, што на гледзячы на неаднаразовыя рашэньні Гаркому аб фарсаваньні будаўніцтва ЦЭЦ гэтае пытаньне не знайшло канчатковага вырашэньня ў адпаведных органах. Улічваючы пагражаючае становішча з будаўніцтвамі ЦЭЦ з прычыны незвараначальнай пытаньня аб фінансаваньні, снабжэньні матар'ялямі, а таксама і тое, што далейшае затрыманьне будаўніцтва ставіць у пяжкае становішча снабжэньне прамысловасьці гораду электраэнэргіяй, даручыць Бюро Гаркому неадкладна паставіць гэта пытаньне ў ЦК КП(б)Б.

11. Надаючы надзвычай важнае значэньне транспарту на будаўніцтве Пленум Гаркому і Гар. КК абавязвае Савнаркомгор забясьпечыць снабжэньне будаўнічага транспарту неабходнай колькасьцю фуражу. Абавязаць бударганізацыі зьвярнуць асаблівую увагу на палепшэньне транспарту, унутраную арганізацыю работы ў ім, ліквідацыю абезлічкі ў абслугоўваньні коняй, ліквідацыю прастояў, арганізаваўшы плянавае скарыстаньне і чарговасьць перавозак на асобных набудовах.

12. Адзначаючы зусім незадавальняючую пастаноўку гаспадарчага разрахунку на ўсіх зьвеньнях будаўніцтва (да гэтага часу значная частка пабудоў не знаходзіцца на гаспадарчым разрахунку), Пленум Гаркому і Гар. КК абавязвае бударганізацыі поўнасьцю перакласьці на сапраўдны гаспадарчы разрахунак усе пабудовы.

13. Адзначаючы зусім незадавальняючае становішча з падрыхтоўкай да будаўніцтва на саўгасах, Пленум прапануе:

а) Кіраўніком саўгасаў па працягу 3-х дзён канчаткова ўстанавіць точкі будаўніцтва.

б) Зараз-жа разгарнуць падрыхтоўку і вывазку мясцовых матар'ялаў, асабліва лесу такімі тэмпамі, каб лес і іншыя мясцовыя матар'ялы былі вывезены на працягу існаваньня саннага шляху.

в) Прапанаваць бударганізацыям ня менш 40 проц. усяго сельска-гаспадарчага будаўніцтва рабіць выключна з мясцовых матар'ялаў.

14. Пленум Гаркому і Гар. КК знаходзіць, што матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочых будаўнікоў патрабуюць карэнных палепшэньня. Большасьць інтэрнатаў і бараках да гэтага часу не падрыхтаваны да абслугоўваньня і прыёму новых рабочых, шмат сур'ёзных недахопаў маюць яшчэ сталоўкі і падзвычайна нізкая якасьць абеду), арганізаваны ЗРК яшчэ да гэтага часу не разгарнуў як належыць работу, асабліва па лініі самазагатовак, неарганізавана пераважнае снабжэньне ўдарнікаў і ўдарных прафесій (каменшчыкі, цесьляры, кадравыя рабочыя і г. д.).

Пленум абавязвае парт. і праф. арганізацыі будаўніцтва ў сваёй падрыхтоўцы да будаўніцтва зьвярнуць асаблівую ўвагу на забесьпячэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых. Для чаго: зараз-жа падрыхтаваць інтэрнаты і бараки для прыёму рабочых, зрабіць неабходны рамонт, арганізаваць абслугоўваньне рабочых у бараках пасьцельнай бялізнай, увесьці цьвёрдыя правілы ўнутранога распарадку, вылучыць інтэрнаты ў самастойныя гаспадарчыя адзінкі, зараз-жа прывесьці сталоўкі ў належны выгляд, укамплектаваць абслугоўваючым персаналам, палепшыць якасьць іх работы, арганізаваць пры кожнай сталоўцы сьпіна-адкормачныя апэрацыі.

Праўленьню ЗРК і сталоўкам зараз-жа разгарнуць работу па самазагатоўках, арганізаваўшы пераважнае снабжэньне ўдарнікаў і ўдарных прафесій, скарыстаўшы вольны перадавых прадпрыемстваў, якія ёсьць у гэтым напрамку.

15. Важнейшай умовай пасьпяховага правядзеньня будаўнічых работ зьяўляецца ўмацаваньне партыйна-масавай работы на будаўніцтве, шляхам перанясьненьня цэнтру цяжару партыйна-масавай работы непасрэдна на набудову і ў брыгаду, разгортваньня шырокай масавай работы навокал аживленьня 6-ні ўмоў т. Сталіна.

Пленум абавязвае партыкалектывы бударганізацый дыферэнцыяваць сваю масавую работу ў адносінах да асобных груп рабочых (сезонныя, сталыя кадры), разгарнуць работу вытворчых нарад па прафэсіях (каменшчыкі, цесьляры).

Пленум даручае Бюро Гаркому пераглядзець структуру партарганізацый на будаўніцтве, падпарадкаўшы партыйныя ячэйкі буйных набудоў непасрэдна Гаркому КП(б)Б. Пленум даручае Бюро Гаркому ўзмацніць партыйнымі сіламі цагельныя заводы з такім разьлікам, каб на кожным заводзе мець партыйную ячэйку.

Гаркому ЛКСМБ праверыць становішча камсамольскай арганізацыі на будаўніцтве, забясьпечыўшы больш актыўны ўдзел камсамольскай арганізацыі ў будаўніцтве.

УЗМАЦНЕНЬНЕ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ— ЗАДАЧА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ БССР

ВІЦЕБСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ АСОАВІЯХІМУ У ПЕРАДАВЫХ РАДОХ БАРАЦЬБІТОУ ЗА АУЛАДАНЬНЕ ВАЙСКОВАЙ СПРАВАЙ

Так трэба працаваць

Перавыбарчая кампанія ячэек Асоавіяхіму па Віцебскім раёне была ператорвана ў палітычна-масавую кампанію па мабілізацыі рабочых і працоўных мас на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны. У часе справаздачна - перавыбарчай кампаніі па прадпрыемствах арганізаваны 3 ударныя цэхі Асоавіяхіму, 38 ударных брыгад, 18 брыгад у калгасах: 12— у навучальных установах.

Вынікі перавыбарчай кампаніі і агульнае становішча работы Віцебскай арганізацыі Асоавіяхіму падагуліла другая канфэрэнцыя, якая адбылася 22-24 сакавіка. Арганізацыя ўзрасла да 28.471 чал. За справаздачны перыяд праз ваенна-вучэбныя пункты розныя відамі вайсковай вучобы ахоплена 7.200 чал. Вайсковым навучаньнем на школах ФЗВ, ФЗС і ШКМ ахоплена 6.200 чал. Вайскова-вучэбныя пункты забясьпечаны ўсімі неабходнымі вайсковымі прыладамі, літаратурай.

Значна палепшылася работа СПА. Толькі за 2½ месяцы 1932 г. арганізавана 8 пунктаў СПА і 22 каманды, дзе зараз навучаецца каля 1.000 чал. Больш 700 чал. ліквідавалі сваю нясьпісьменнасьць і 15.000 чал. зараз навучаюцца ў камандах. 43.000 чал. прайшлі 6-цігадзінную праграму ліквідацыі хэнгнясьпісьменнасьці.

Значная работа праведзена па вывучэньні авіясправы. За 1931 год падрыхтавана 212 чал.

Гарадзкім саветам Асоавіяхіму арганізавана спэцыяльная пераспэтная стралковая школа. Практычная дзейнасьць гэтай школы выражаецца ў арганізацыі ў калгасах і саўгасах 59 ячэек і 3 саветаў Асоавіяхіму. Завербавана ў рады Асоавіяхіму звыш 3.500 калгаснікаў і з іх 1.167 жанчын. Стралковымі гурткамі ахоплена 262 чал., больш 5.500 калгаснікаў прапушчана праз агітпункты. Значную работу асоавіяхімаўцы правялі ў галіне барэньбы са шкодзікамі гарадоў і палёў. Ад шкодзікаў былі ачышчаны 54 гэкт.

Арганізацыя Асоавіяхіму прымае актыўны ўдзел у правядзеньні ўсіх гаспадарча - палітычных задач. Уключыўшыся ў кампанію дарожнага будаўніцтва Асоавіяхімам праведзена 14 суботнікаў, на якіх прыняла ўдзел 1.874 чал. Актывам арганізавана 5 чырвоных абозаў розных культур. Падрыхтоўчая работа да трэцяй бальшавіцкай сяўбы выражаецца ў арганізацыі 20 ударных брыгад па ачыстцы насеньня, зборы 10 тон люпелу. Кожны калгас прыняў пастанову звыш пляну засеяць адзін гэктар у фонд абароны краіны.

Побач з гэтым трэба адзначыць слабую работу добраахвотных сэктароў гарадзкога савету, якія за выключэньнем сэктару службовых сабак і паштовага галубаводзтва ў сваёй рабоце значнага зруху яшчэ не маюць. Трохгодка росту арганізацый недавыкананa на 13.853 чал. што тлумачыцца бязьдзейнасьцю роду саветаў і ячэек Асоавіяхіму (акулярная, сьпіртзавод, гарбарня, ічачніны камбінат і інш.). Вельмі слаба разгорнута на пунктах масавая работа. Сацыяборніцтва і ўдарніцтва ў радзе арганізацый укараняюцца вельмі марудна. Гэта абавязвае гарадзкі камітэт узмацніць сваё кіраўніцтва гэтымі арганізацыямі з тым, каб прарыў у хутчэйшы час быў канчаткова ліквідаваны.

Канфэрэнцыя закончыла сваю работу прэміраваньнем лепшых арганізацый Асоавіяхіму, «Чырвонага мэталіста» і фанэрнага заводу.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

На занятках курсаў падрыхтоўкі інструктароў СПА для работы ў вёсцы

Садзейнічаць разьвіцьцю грамадзянскай авіяцыі

Будаўніцтва першай у БССР школы грамадзянскіх лётнікаў Асоавіяхіму імя тав. Варашылава патрабуе вялізарных сродкаў. Школа ўзьнікла па ініцыятыве пралетарскай грамадзянскай і яе будаўніцтва вядзецца таксама пры яе дапамозе. Аднак, ня гледзячы на важнае значэньне разьвіцьця грамадзянскай авіяцыі і на запатрабаваньні рабочых і працоўных мас Беларусі аб будаўніцтве ў БССР аэрадрому і пасадачных плянцовак, аб устанаўленьні грамадзянскіх паветраных ліній, многія арганізацыі Асоавіяхіму дрэнна адносяцца да збору сродкаў на грамадзянскую авіяцыю.

На сёньняшні дзень ёсьць наступныя паступленьні: ад Менскага гарсавету — 3.200 руб. (у той час як сабрана 4.966 руб), Полацкага — 3.000 руб., Касьцюковіцкага — 105 руб., Чырвона - Слабодзкага — 61 руб., Пухавіцкага — 17 руб.

Трэба адзначыць ударныя тэмпы работы Віцебскага гарадзкога савету, які на падставе шырока разгорнутага спаборніцтва сабраў 75.000 руб. і зараз узяўся за выкананьне сустрэчнай лічбы ў 33.000 руб. звыш раскладкі.

Арганізацыям Асоавіяхіму сумесна з партыйнымі, камсамольскімі, прафсаюзнымі арганізацыямі зараз - жа ўзяцца за збор сродкаў і правесьці работу в такім разьлікам, каб усе паступленьні закончыліся да першага мая гэтага году.

Будзіловіч.

Мабілізуем сродкі на абарончую работу!

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму СССР, на падставе пастановы СНК СССР ад 21 ліпеня 1931 г. і дазволу Наркамфіну ў гэтым годзе праводзіць шостую ўсесаюзную лётарэю.

У абарончы фонд СССР павінна быць сабрана 50 млн. руб. Гэтым сродкі дадуць магчымасьць Асоавіяхіму шырэй разгарнуць працу па падрыхтоўцы працоўных да абароны краіны Саветаў.

На гэтыя сродкі будуць пабудаваны аэрадромы, школы грамадзянскай авіяцыі, вучэбныя пункты, дамы абароны і савецкія дырыжаблі.

Па шостай лётарэі выпускаецца 70 млн. білетаў, з якіх 40 млн. коштам у 50 к. і 30 млн. — па 1 руб.

Беларуская арганізацыя Асоавіяхіму павінна рэалізаваць білетаў на суму 1.600 тыс. руб.

Шмат гарадзкіх і раённых саветаў ужо далі сустрэчны плян рэалізацыі білетаў. Аршанскі раённы савет замест кантрольнай лічбы ў 67.300 руб. высоўвае сустрэчную — 90.000 руб. і ўжо правёў вялікую падрыхтоўчую работу на давядзеньні гэтага пляну да кожнай ячэйкі. Віцебскі гарсавет замест 50.700 руб. высоўвае сустрэчную на 200 000 і на сёньня ўжо ўнёс 24.500 руб.

Усю работу па рэалізацыі білетаў шостай лётарэі неабходна паставіць на рэйкі сацыяборніцтва і ўдарніцтва і дабівацца ад усіх ячэек выканаваньня заданьняў і пераводу сродкаў своечасова. Задача гарадзкіх і раённых арганізацый Асоавіяхіму арганізаваць шырокае правядзеньне агітмасавай работы.

МІНЬКОЎ.

Камісіі па клясавым адборы і ліквідацыі кяпісьменнасьці бязьдзейнічаюць

Прыняка дапрызыўнікаў 1910 г. па г. Менску даўно ўжо скончылася. У прызыўцы выяўлена звыш 40 чал. нясьпісьменных і каля 200 чалавек малапісьменных, сярод якіх у бліжэйшы тэрмін неабходна ліквідаваць нясьпісьменнасьць і гэтым самым даць магчымасьць прызываемым у армію быць гатовымі да найлепшага ўсваеньня тэй тэхнікі, якою цяпер насычана армія.

Работа па ліквідацыі нясьпісьменнасьці ўскладзена на гарадзкую інспэкцыю асьветы. Трэба адзначыць, што да гэтага часу за выключэньнем 2-га раёну міліцыі нічога ня зроблена для выкананьня гэтай задачы. Камісія па ліквідацыі нясьпісьменнасьці ні разу ня склікалася і гэтым пытаньнем ня цікавілася. У гэтым пытаньні існуе поўная абязьлічка. Камісія спасылаецца на райваенкамат, а райваенкамат у сваю чаргу спасылаецца на камісію, а дапрызыўнікі, якія былі нясьпісьменнымі, такімі-ж застаюцца і надалей.

Неабходна зараз-жа камісіі па ліквідацыі нясьпісьменнасьці скласьці цьвёрды плян сваёй работы, паставіць пытаньне перад партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі прадпрыемстваў аб забесьпячэньні 100 проц. ліку дапрызыўнікаў на ліквідпункты. Прыцягваць да адказнасьці асоб, якія спрыяюць гэтую работу.

Побач з гэтым камісіі па клясавым адборы таксама трэба разварушыцца і прыступіць да работы, шырока ўцягнуўшы ў гэту работу пралетарскую грамадзкасьць.

Пры прызыве ў армію ў першую чаргу патрэбна ведаць клясавы твар кожнага прызываемага, а пры такой рабоце па клясавым адборы, якая вядзецца цяпер (якая зусім не вядзецца) нясумненна гэтага матар'ялу прызыўныя камісіі ніпрымаць ня змогуць. Гарсавету, пад кіраўніцтвам якога працуе камісія, неабходна ажывіць гэту камісію і зрабіць яе працаздольнай.

Гарком камсамолу зусім ня прымае ніякага ўдзелу ў гэтай рабоце.

Час, які застаецца, неабходна максымальна выкарыстаць для таго, каб ліквідаваць гэты буйнейшы недахоп на фронце агульнай работы па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны.

Федаровіч.

Бліжэйшы памочнік партарганізацыі

Камсамольская арганізацыя беларускай стралковай дывізіі імя Фрунзэ на сваёй 7-ай канфэрэнцыі падагуліла гадавы вынік работы з часу пераходу армейскага камсамолу ад груп садзейнасьці партыі на сыстэму ячэек. Гэты пераход азначаў зусім новае ў жыцьці камсамолу ня толькі ў зьмене арганізацыйнай структуры, а галоўнае ў тым, што вязьмерна ўзрасьлі патрабаваньні і ўскладніліся задачы, якія стаяць перад камсамолам, як памочнікам партарганізацыі ў рабоце за тэмпы і якасьць баявой і палітычнай вучобы.

Камсамол вырас у магутную палітычную арганізацыю, заваляваў вялізарны аўтарытэт у чырвонаармейскіх масах, адыгрывае надзвычай важную ролю ва ўсёй сыстэме баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Камсамол дывізіі прышоў да сваёй канфэрэнцыі ідэалёгічна вырасшым і ўстойлівым. Ён моцна згуртован вакол бальшавіцкай партыі і па-баявому здолен змагацца, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, за ажыцьцяўленьне задач, што стаяць перад РСЧА.

Сярод камсамольцаў глыбока прапрацаваны ліст тав. Сталіна ў часопісь «Пролетарская революция» і гістарычныя пастановы XVII партканфэрэнцыі; прапрацаваны прас партыйна-саюзныя школы, праз індывідуальна-групавыя заданьні і палітгурткі. На аснове гэтага камсамолія дывізіі яшчэ больш згуртавалася вакол генэральнай лініі партыі, павысіла клясавую пільнасьць і непрымірымасьць у барацьбе супроць апартунізму, прымірэнцтва і гнілога лібералізму. Партыйна-саюзнай асьветай ахоплена амаль 100 проц. камсамольцаў. Побач з гэтым існуе сыстэма індывідуальных заданьняў і дапамогі слабым.

Канфэрэнцыя, выкрыўшы рад недахопаў у справе палітвучобы, паставіла перад камсамольскай арганізацыяй часьцей, як цэнтральную задачу, — узьняць марксыцка-ленінскае выхаваньне на вышэйшую сучасных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Змагаючыся за ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі, камсамол бязьлітасна вядзе барацьбу з ухілам і нацпытыньні, з праўленьнямі шавінізму і антысэмітызму.

Ф.

А. БЭРЗІН, В. МЯЦЕЛЬСКІ

Хэмізацыя—ключ да падваеньня ўраджайнасьці

Хэмізацыя сельскай гаспадаркі — наступае за трактарызацыяй зьвяно, пры дапамозе якога мы павінны вырашыць цэнтральную праблему арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў — праблему ўздыму ўраджайнасьці.

XVII партканфэрэнцыяй дана дырэктыва аб завяршэньні ў канцы другой пяцігодкі ў асноўным мэханізацыі і інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі. Канфэрэнцыя зрабіла асаблівы ўпор на разьвіцьцё вытворчасьці мінэральных угнаеньняў.

Уздым ураджайнасьці, стварэньне моцнай сыравой базы для лёгкай прамысловасьці, неабходнасьць да канца другой пяцігодкі «забясьпечыць на бавоўне і ільне ня менш чым падваеньне ... на цукровых буракох патраеньне ... прадукцыі» (з пастановы XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б)) патрабуе хуткага правядзеньня хэмізацыі сельскай гаспадаркі.

Ажыцьцяўленьнем агратэхнічных дасягненьняў, як севазвароты, ... глебы і інш. на базе мэханізацыі ... пастаўленую задачу — падваеньне ўраджаяў тэхнічных, кармовых і збожжавых культур — БССР можа лёгка выканаць.

Выключную ролю ў гэтай справе адыгрываюць угнаеньні, на долю якіх між іншых агранамічных мерапрыемстваў у павышэньні ўраджайнасьці на падзольных глебах (глебы БССР) прыпадае ад 50 да 75 проц.

Досыць спрыяючы і вільготны клімат Беларускі вызваляе вялікі эфэктыўна скарыстаць угнаеньні і лёгка інтэнсыфікаваць паляводзтва. Пры адпаведнай запраўцы глебы ўгнаеньнямі зусім рэальным зьяўляецца атрыманьне на працягу году двух ураджаяў кормовых і іншых культур.

Горацкая запальная станцыя малочнай гаспадаркі, пры ўжываньні поўнага мінэральнага ўгнаеньня, атрымала ў мінулым годзе жыта на зялёны корм—140 цэнтн. на га (убраяна 25-У) і бручкі (пры пасадцы расадай пасьля ўборкі жыта) — 350 цэнтн. на га. У нашых умовах ёсьць бясспрэчная магчымасьць пасеву пасьля азімай кармовай мешанкі цэлага раду кармовых культур, а пры раньніх пасевах атрыманьня двух ураджаяў яравых кармавых мешанак (віка-аўсянай мешалкі).

Адзінай перашкодай, якая затрымлівае шырокае правядзеньне гэтых мерапрыемстваў, зьяўляецца беднасьць нашых глеб спажыўнымі матэрыямі.

Пераважная частка глеб БССР належыць да супяскоў тэй ці іншай зьвязанасьці, менш распаўсюджаны суглінкі, а ў апошні час за кошт асушаных нізінных тарфянікаў пашыраюцца плошчы і арганічных глеб.

Усе гэтыя глебы бедны асноўнымі спажыўнымі матэрыямі для добрага росту расьлін і патрабуюць азотных, фосфарна-кіслых і калійных угнаеньняў.

Аб уплыве ўгнаеньняў на асноўныя глебы БССР у справе ўздыму ўраджайнасьці паказваюць наступныя даныя: на менскай бульбянай дасьледчай станцыі на супяскох без гною атрымлівалі 128 цэнтн. бульбы з га, а пасьля ўнясеньня 360 цэнтн. гною атрымлівалі 181,5 цэнтн. бульбы. На Горацкай станцыі без угнаеньня атрымалі 107,8 цэнтн., пасьля ўнясеньня гною атрымалі 144,3 цэнтн. Ураджай жыта на Горацкай станцыі пасьля ўнясеньня ўгнаеньня павысіўся ў 2 разы і дасягаў 13,8 цэнтн. з га. Становішча ўплыў угнаеньняў на іншыя сельска-гаспадарчыя культуры —правыя збожжавыя травы, лён, канопі і інш. бывае часта нават яшчэ большы, чым ў паданых лічбах. Так, на асушаным тарфяніку Горацкай дасьледчай станцыі без угнаеньня атрымалі канапель 14,2 цэнтн. саломы і 1,6 цэнтн. зерня на га, пры ўнясеньні поўнага мінэральнага ўгнаеньня быў атрыман ураджай 75 цэнтн. саломы і 7,9 цэнтн. зерня канапель.

Усё гэта гаворыць аб тым, што належнае ўгнаеньне глебы, палваеньне і нават патраеньне ўраджайнасьці асноўных сельска-гаспадарчых культур —справа зусім рэальная.

Якім-жа шляхам мы павінны пайсьці пры вырашэньні такога важнага пытаньня, як угнаеньне глебы?

У першую чаргу трэба жорстка ставіць пытаньне аб максымальнай мабілізацыі і правільным скарыстаньні ўсіх мясцовых угнаеньняў — гною, торфу, зялёнага ўгнаеньня, попелу і г. д., трэба поўнасьцю і ў адпаведнасьці з агратэхнічнымі патрабаваньнямі скарыстаць тыя мінэральныя ўгнаеньні, якія мы маем.

Вельмі актуальным зьяўляецца зараз пытаньне аб забесьпячэньні мінэральных глеб азотам для стварэньня ўстойлівых высокіх ураджаяў кармовых (не бабовых) і тэхнічных культур. Хэмічныя камбінаты - гіганты, якія ўступаюць у строй — Бярэзьнікоўскі, Бобрыскі, Горлаўскі і інш. на бліжэйшы час яшчэ ня здолеюць забясьпечыць нас поўнасьцю азотам у выглядзе азотных мінэральных угнаеньняў. Да і ставіць пытаньне аб 100 процантным забесьпячэньні палёў прывозным азотным мінэральным угнаеньнем будзе няправільна, у той час, калі на мясцох ёсьць для гэтага неабмежаваныя магчымасьці. Характэрна, што ў Нямеччыне з высокаразьвітай хэмічнай прамысловасьцю забесьпячэньне глебы азотам ідзе наступным чынам: ⅓ патрэбнага азоту ўносіцца ў глебу з гноем, каля ⅓ азоту накапляецца праз пасевы бабовых расьлін і толькі ⅓ частка даецца ў выглядзе мінэральных угнаеньняў.

Увядзеньне правільнага севазвароту з пасевамі бабовых расьлін (канюшыны, вікі, лубіну, гароху, сэрадэлы і г. д.), большае накапленьне і скарыстаньне гною, торфу і хатніх адкідаў у выглядзе кампостаў — дае нам вялікія магчымасьці для забесьпячэньня глебы азотам.

Больш сур'ёзную ўвагу трэба зьвярнуць на правільнае здабываньне і захоўваньне гною. З прычыны таго, што гэта пытаньне ў нас прынята лічыць другарадным, трапіцца даромна шмат азоту. Сапраўды, калі падлічыць колькі азоту трапіцца ад таго, што частка жыжы пры недахопе подсьцілу выцякае, або прасочваецца праз падлогу хлявоў, а таксама той азот, які ўлятучваецца ў выглядзе аміяку пры надбайным захоўваньні гною, дык гэта складзе вельмі вялікую лічбу. Калі мы пры наяўнасьці на БССР каля 20 мільёнаў тон гною страцім толькі адзін процант у ім азоту, то гэта дае страт каля 5.000 тон сернакіслага амонію. Страты-ж пры дрэнным і надбайным захоўваньні і ўжываньні гною даходзяць да 50 і больш проц.

Асноўнае мерапрыемства для пазбаўленьня гэтых страт пры нашых спробах захоўваньня гною — гэта пабудова шчыльных падлог і дастатковае забесьпячэньне падсьцілачным матар'ялам для поўнага паглынаньня ўсёй жыжы.

Пры забесьпячэньні БССР падсьцілачнай саломай толькі на 50-60 проц. трэба рашуча паставіць пытаньне аб масавай загатоўцы ўжо ў бягучым годзе тарфянога подсьцілу. Для гэтага з посьпехам можна скарыстаць усе махавыя балоты, купнік пры ачыстцы севажацей і торф нізавых балот. Паколькі высушаны тарфяны подсьціл, па сапраўдным дарозе, магчыма перавозіць на значныя адлегласьці, то размовы аб адсутнасьці ў гаспадарцы адпаведных тарфянікаў не павінны мець месца. Загатоўку тарфянога подсьцілу трэба лічыць як адно з важнейшых мерапрыемстваў, якое накіравана на ўздым ураджайнасьці.

Саўгасы і калгасы ў сваіх рабочых плянах павінны адвесьці адпаведнае месца на загатоўку падсьцілачнага торфу. Трэба ўзьняць пытаньне аб больш хуткім разгортваньні будаўніцтва мэханізаваных заводаў на выробе просаванага падсьцілачнага торфу. Як распазнаецца тарфяны подс

У Шанхаі балбатня дыплёматаў аб „міры“,

А НА ФРОНЦЕ—КУЛЯМЁТНАЯ ТРАСКАТНЯ

У Люхэ сьпешна высаджваюцца новыя японскія часьці

ЯПОНСКІЯ ПАДМАЦАВАНЬНІ ІДУЦЬ НА ФРОНТ

ШАНХАЙ, 29. З кітайскіх крыніц паведамляюць, што ў той час, як дыплёматычныя ваенныя прадстаўнікі абмяркоўваюць пытаньне аб перамір'і, па ўсім фронце штодзённа адбываюцца крывавыя сутычкі. Побач з гэтым японцы сьпешна праводзяць ваенную загатоўку і высаджваюць у Люхэ дадатковыя ваенныя часьці. 27 сакавіка ў Хундао адбыліся сур'ёзныя сутычкі паміж японцамі і кітайцамі, якія суправаджаліся перастрэлкай на працягу 30 хв. Японцы, перайшоўшы ў брод раку, адкрылі агонь па кітайскіх пазыцыях. Кітайскі друк паведамляе таксама аб сур'ёзнай сутычцы ля Тайцана, якая суправаджалася кулямётнай стральбой і працягвалася дзве гадзіны. Звыш тысячы японскіх салдат адпраўлены з кулямётамі в Люхэ ў напрамку на Цзядана. Значныя японскія падмацаваньні пасланы з Нанояна ў Малон, Цзядань Ляодань.

Замест Манчжуры—у Ханькоу

ШАНХАЙ, 29. Калі стала вядома, што камісія Лігі нацый сабралася месцы на параходзе для ад'езду з Нанкіну ў Ханькоу, кітайскія колы рэзка выказаліся супроць паездкі камісіі, якая (камісія) мяркуецца, лічачы, што гэта паездка будзе азначаць перамогу японскай дыплёматыі. Кітайскія газэты ўказываюць, што японцы аказалі націск на членаў камісіі, патрабуючы яе паездкі ў Ханькоу. Прадстаўнік нанкінскага ўраду заявіў: камісія пасланa ў Кітай з поўнай мэтай вывучыць мінулыя і сучасныя ўмовы ў Манчжуры. Усякае адтэрміноўваньне, або непатрэбныя паведаўленьні гарадоў выходзяць за межы яе абавязкаў. Паводле паведамленьня з Ханькоу, японскія ўлады ўзмоцнена займаюць падрыхтоўкай да сустрэчы камісіі Лігі нацый, ачышчаюць вуліцы, разьбіраюць барыкады, дротавыя загарожы і г. д.

Бюджэт манчжурскай дзяржавы

БЭЙПІН, 19. Газэта «Манчжурыя-Дэйлі-Ньюс» паведамляе, што, паводле прыблізных вылічэньняў, даходная частка бюджэту манчжурскага ўраду складзена ў суме 120 млн. даляраў.

Паступленьні	— 100 млн. даляраў.

Сума, якая не хапае, будзе атрымана шляхам рэалізацыі ўнутранай пазыкі або шляхам выпуску ўраданых абавязацельстваў.

ЯПОНЦЫ І КІТАЙЦЫ КАНЦЭНТРУЮЦЬ СВАЕ ВОЙСКІ

ШАНХАЙ, 29. Паведамляюць, што Ван Цзін-вэй паінфармаваў кітайскага дэлегата на шанхайскай канфэрэнцыі Го Тай-ці, што нанкінскі ўрад парашыў прытрымлівацца цьвёрдай пазыцыі ў пытаньні аб вываде японскіх войск з Шанхаю. Указваюць, што ў выпадку абмаўленьня японцаў адвесьці свае войскі на пазыцыі, занятыя імі да 28 студзеня, кітайскія ваенныя ўлады будуць падрыхтаваны да адпаўленьня з японцамі ваенных дзеяньняў. Газэта «Чайна прэс» паведамляе, што першая дывізія нанкінскіх войск, якая знаходзіцца ва Усу, атрымала загад пасьледваць на фронт па злучэньне з 19 арміяй. Паведамляюць таксама, што японскія падмацаваньні ўсё яшчэ высаджваюцца ў Люхэ, дзе ўжо сканцэнтравана 30.000 японскіх войск.

Японія дамагаецца прызнаньня Лігай нацый манчжурскай дзяржавы

БЭРЛІН, 29. Агенцтва Вольф паведамляе з Токіё, што паводле некаторых вестак японскі міністар замежных спраў нібы заявіў, што Японія мяркуе выйсьці з Лігі нацый у выпадку, калі новая манчжурская дзяржава, наперакор чаканьням, ня будзе прызнана ў бліжэйшы час Лігай нацый. У Японіі прытрымліваюцца таго пункту гледжаньня, што выпаўшы са складу Лігі нацый Японія шмат выйграе і нічога не страціць, бо ў гэтым выпадку наступіць канец разгадосьсям, якія існуюць у цяперашні час паміж Японіяй і Лігай нацый і якія, згодна японскага пункту гледжаньня, спрыялі падрыву ўсеагульнага міру. Апрача таго, у гэтым выпадку спыніцца - б «непатрэбнае ўмяшаньне» Лігі нацый у японска - кітайскі канфлікт і Кітай прымушан быў - бы прытрымлівацца неабходнасьці весьці перагаворы непасрэдна з Японіяй. З другога боку, Японія не апынулася - б у неабходнасьці паставіць на карту прызнаньня адносіны з іншымі дзяржавамі, якія да гэтага часу падтрымліваюцца.

НА ЗДЫМКУ: Усун пасьля бамбардыроўкі японскай артылерыяй.

ВЫКРЫЦЬ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ ВАЙНЫ

Адказ Анры Барбюса на анкету МОПР'у

Мае адносіны да вайны неагул і, у прыватнасьці, да міжнароднай бойні, якая падрыхтоўваецца, і да нападу на СССР зьяўляюцца адносінамі рэвалюцыянэра і камуніста.

Да вайны 1914 году я быў пацыфістам і верыў у арбітраж паміж нацыямі і ў магчымасьць уніканьня канфліктаў пры дапамозе мерапрыемстваў і згод паміж «нацыямі». Падзеі далі мне больш вырэзнае ўяўленьне аб сапраўднасьці, і я лічу сёньня гэту штучную канцэпцыю ня толькі ілжывай і небясьпечнай, але і забойчай.

Усе прапямацыі і ўсе меры, якія выходзяць ад вялікіх дзяржаў, што знаходзяцца ў руках «дзелавых людзей», маюць на мэце АШУКАНСТВА МАС. Капіталізм, з навары на канкурэнцыі і на эканамічнай вайне, ня можа жыць інакш, як згодна антаганістычным прынцыпам; апошнія рана ці позна прыводзяць да УЗБРОЕНАЙ СУТЫЧКІ. Калініяльныя экспансіі і іншыя формы імпэрыялістычных захватаў усё больш і больш адчуваюць патрэбу ва УЗБРАЕНЬНЯХ. Узбраеньне неабходна ў адпаведнай ступені і для абароны буржуазнай улады супроць наступленьня эксплёатаванай і прыгнечанай рабочай клясы.

Сучаснае міжнароднае становішча абрэзьтываецца няроўнымі і несправядлівымі дагаварамі, навязанымі пераможным нацыям у рэзультаце вайны 1914 году, і эканамічным крызісам, глыбокай прычынай якога зьяўляецца бясьсільне капіталізму справіцца з эканамічнымі, сацыяльнымі і міжнароднымі праблемамі. Буржуазны рэжым, які знаходзіцца пры апошнім здыханьні, прабуе захаваць уладу двума спосабамі: гвалтам — выключнымі законамі, фашызмам, а таксама дэмакратычным і пацыфісцкім шарлятанствам, які ўводзіць у эман даверлівыя розумы.

ВАЙНА ТАКСАМА НЯМІНУЧА НА ЗАЎТРА ПАСЬЛЯ АПОШНЯГА ЎСЕАГУЛЬНАГА МІЖНАРОДНАГА ПАЖАРУ, ЯКОЮ ЯНА БЫЛА НАПЯРЭДАДНІ ГЭТАГА КРЫВАВАГА НЯШЧАСЬЦЯ. Кватрычніцкая рэвалюцыя, якая вызвала вялікую краіну і зрабіла з яе вялізарнае вогнішча сацыялістычнага будаўніцтва ў процівагу імпэрыялістычнаму сьвету, нарадзіла на земнай кулі двойчасьць, якую буржуазная ўлада ня можа дапусьціць. Яніі-б розьмі ня быці ў пэўных выпадках інтарэсы імпэрыялістычных краін, апошнія знаходзяць адзіную глебу ўзгадненьня ў сваім агульным жаданьні захаваць рабства рабочай клясы і зруйнаваць рэальныя, непараўнальныя рэзультаты сацыялістычнай перабудовы паловы Эўропы і паловы Азіі.

КЛЯСАВАЯ НЯНАВІСЬЦЬ СУПРОЦЬ СССР БЫЛА АДНЫМ З ФАКТАРАЎ СПАЧУВАНЬНЯ КАПІТАЛІЗМУ І, У ПРЫВАТНАСЬЦІ, ЭЎРАПЭЙСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ, У НАПАДЗЕ ЯПОНІІ НА МАНЧЖУРЫЮ І Ў ЯЕ АДКРЫТАЙ СПРОБЕ ПАЧАЦЬ КАЛЕНІЗАЦЫЮ АЗІІ Ў СВАІХ ІНТАРЭСАХ.

Агульны абавязак работнікаў фізычнай і разумовай працы і асабліва пісьменьнікаў, якія на могуць пакінуць бяз увагі гэты стан рэчаў, не парушыўшы сваёй місіі прадстаўнікоў грамадзкасьці і салдат сваёй клясы, — АДКРЫЦЬ ВОЧЫ НА АБСТАНОЎКУ, ЯКАЯ СТАЛА БОЛЬШ ТРАГІЧНАЙ, ЧЫМ КАЛІНЕБУДЗЬ. Гэтага патрабуюць інтарэсы і будучае чалавецтва.

ЕРАЦКІ ВАШ АНРЫ БАРБЮС.

Лёйд-Джордж аб даўгох і рэпарацыях

ЛЁНДАН. Пасьля даволі доўтага перапынку Лёйд-Джордж вярнуўся ў Лёндан. Зварот Лёйд-Джорджа адзначыўся некалькімі выступленьнямі, кожнае з якіх выклікала свайго роду сэнсацыю. Зараз у Лёнданскіх колах, дый ва ўсёй замежнай прэсе ўзмоцнена камэнтуецца выступленьне Лёйд-Джорджа па пытаньні АБ РАПАРАЦЫЯХ.

Лёйд-Джорджам выпушчана кніга, першая частка якое носіць трэтэнцыйную назву «Шлях у Дамаск». У гэтай кнізе ён рэзка выступае супроць палітыкі Пуанкарэ, заўважаючы, што «адносіны Пуанкарэ да Германіі падобны на адносіны члена арміі ратунку да чорта». Лёйд-Джордж заўважае, што ўся палітыка Францыі, пачынаючы з Вэрсалю, была шкодная і хлусьлівай. Ён патрабуе поўнага скасаваньня рэпарацый. Лёйд-Джордж указвае, што, паводле французскіх даных, Германія, пачынаючы з пярамір'я і канчаючы 1 ліпеня 1931 г., ужо заплаціла 1.010 млн. фунтаў стэрлінгаў. Па ацэнцы вашынгтонскіх колаў агульная сума выплачанай кантрыбуцыі раўнялецца 1.905 млн. фунт. стэрлінгаў. Нават сума, паказаная французамі, перавышае кантрыбуцыю, выплачаную Францыяй пасьля вайны 1871 г. У ПЯЦЬ РАЗ.

Лёйд-Джордж асуджае таксама палавінную і нерашучую палітыку Англіі ў пытаньні аб рапарацыях і міжсаюзьніцкіх даўгох. Поўная ліквідацыя даўгоў і рэпарацый, — заяўляе ён, — першая ўмова перамаганьня крызісу, у прыватнасьці, перамаганьня амэрыканскага крызісу. Лёйд-Джордж асабліва доўга спыняецца на палітычным становішчы ў Германіі і на небясьпецы рэвалюцыйных патрасеньняў. Ён лічыць, што абавязак Эўропы і Амэрыкі прыйсьці на дапамогу Брунінгу. Бессансоўна, — заяўляе ён, — гаварыць аб сьвятасьці дагаворў. Ад Германіі ўсё роўна нічога не атрымаем, а прывесьці яе да банкрутства было-б пагібельлю для Эўропы.

Што датычыць разабраньня, дык Лёйд-Джордж указвае на тое, што вэрсальскі дагавор наклаў абавязацельствы на абодва бакі. Францыя-ж зусім ня сьледуе гэтым абавязацельствам і яе армія, разам з рэзэрвамі складаецца з 5 МЛН. ЧАЛ. І ШМАТ ТЫСЯЧ ЦЯЖКІХ ГАРМАТ.

Кніга Лёйд-Джорджа выклікала шматлікія водгукі. Кансэрватыўны друк, не задаволены крытыкай Лёйд-Джорджа, указвае на тое, што сам Лёйд-Джордж прымаў кіруючы ўдзел ва ўстаноўленьні вэрсальскай сыстэмы і ў правядзеньні рэпарацыйнай палітыкі. Замест таго, каб гаварыць «я абвінавачваю», — піша «Таймс», — Лёйд-Джордж павінен быў-бы сказаць — «я саграшыў». «Дэйлі Геральд» і частка лібэральнай прэсы вітаюць прапанову Лёйд-Джорджа.

Масавы бязбожніцкі рух у Заходняй Беларусі

ВІЛЬНЯ, 28. Што раз шырэй і шырэй разьлівацца па Заходняй Беларусі хваля бязбожжа. Антырэлігійны рух, у перажываньнях стыхійны, пашыраецца і робіцца з кожным днём усё больш масавым.

Вёска, якая раней лічылася нэпрыступнай цытадэляю рэлігіі, сёньня апошняя магутным рухам бязбожжа. Трапіць устоі духоўнага жандара капіталізму — рэлігіі. Таюць улады агентаў буржуазіі ў чорных сутанах.

Класавы характар рэлігіі вылазіць больш яна, чым калі-небудзь. Прапаведнікі «хрысьціянскай цярпімасьці», пакорнага чаканьня канца крызісу, прапаведнікі бруднага паклёпу на СССР — апынуліся сёньня на мялі.

Масы ня хочуць больш цярпіва і пакорна чакаць галоднай сьмерці. Масы рабочых і сялян уступілі на шлях рэвалюцыйнага выхаду з крызісу і актыўна змагаюцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. На шляху гэтай барацьбы трапіць усе перашкоды, у тым ліку і ўмывы рэлігіі.

Антырэлігійны рух не ня жарты палохае польскую буржуазію. Яе прэса не перастае біць трывогу аб неабходнасьці рашучага запушэньня «гідры бязбожжа». Але наперакор тэрору, якім буржуазія хоча затрымаць рэшткі ўжываў рэлігіі, бязбожны рух расьце і магутнее.

Цяпер у сувязі з вяжкодным сьвятам, віленская буржуазная прэса паведамляе аб цэлым радзе антырэлігійных выступленьняў сялян па вёсках Заходняй Беларусі. На тэрыторыі Віленскага, Маладэчанскага і Валожынскага паветаў разгортваецца антырэлігійная прапаганда. Сярод сялян карыстаецца папулярнасьцю антырэлігійная літаратура. Па падазрэньні ў распаўсюджваньні антырэлігійнай літаратуры ў Валожынскім павеце арыштаваны сяляне Адам Кацура і Васіль Жук.

У Віленчыне паміж вёскамі Францкуны і Судзрня ў рове знайшлі зьнішчаную статую «астрабрамскай багамаціры». У сувязі з гэтам паліцыя арыштавала сялян Барыса Чэрэмка і Вінтара Калесьніка, якіх абвінавачваюць у гэтым «злачынстве».

Віленская прэса з трывогай пішэ пашырэньня бязбожніцкага руху выказвае сялянае здзіўленьне.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Скончана пабудова плаціны Дняпрабуду

КІЧКАС. 28 сакавіка ў 17 гадзін 20 хв. укладзен апошні кубамэтр бетону ў грабёнку плаціны Дняпрабуду. Наказ партыі і ўраду выканан. Веснавая вада прагушчана праз суцэльны бетонны гребень.

1-га мая будзе пушчан алюмінієвы камбінат

ЛЕНІНГРАД. Пачалася падрыхтоўка да пуску алюмінієвага камбінату ў Звянцы. 1-га красавіка распачнецца выпрабаваньне першых агрэгатаў глінозёмнага заводу. У сярэдзіне красавіка адбудзецца выпрабаваньне абсталяваньня электралізнага цэху. Пуск камбінату прыстасоўваецца да 1-га мая. Будаўнічыя работы ў вытворчых карпусах падыходзяць да канца.

Першая савецкая высока-вакуумная калонка ў Баку.

Друкарская фарба з адкідаў

Тарфяная сэкцыя навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці БССР скончыла работу ў лябараторным маштабе па вырабе друкарскай фарбы з адкідаў тэлушчу і пеку, які атрымліваецца пры апрацоўцы тарфяной смалы і сажы. Першыя вопыты, якія праводзіліся ў друкарні выдавецтва «Зьвязда», паказалі добрыя вынікі і поўную прыгоднасьць фарбы для друкарскай справы. Ужываньне новай фарбы дае магчымасьць замяніць такія дарагія матар'ялы, як камфару, што ідзе на экспарт, і аліву, з якое вырабляецца спажыўны прадукт (алей). Камфара і аліва да гэтага часу ўжываюцца для вырабу друкарскай фарбы. Вынайдзены спосаб дасьць магчымасьць зьнізіць сабекошт фарбы прыблізна на 50-60 проц.

Сельгасмашыны

27 сакавіка завод Гомсельмаш выпусьціў 34 сілосарэзкі — 141,7 проц. заданьня, 11 сячкарань — 78,5 проц., 10 бульбамыек — 125 проц., 18 бульбасартовак — 128,6 проц. і 4 канюшынасартоўкі — 160 проц. заданьня.

***

27 сакавіка завод «Чырвоны ізталіст» выпусьціў 12 жмыхадрабілак — 63.2 проц. заданьня, 23 карпярэзкі — 109,5 проц., 26 бульбакапалак — 162,5 проц., 5 балотных плугоў — 312,5 проц., 78 боран «Зіг-заг» — 108,3 проц. і 2 плугі нумар 14 — 166,7 проц. заданьня.

На 1-ай БелДРЭС

26 сакавіка 1-ая БелДРЭС выпрацавала 163.500 клвт.-гадзін энэргіі. Максымум дасягнуў 9.000 клвт., мінімум — 5.600 і сярэдняе 6.800 клвт.

Будматар'ялы

ЦЬВІКІ. 27 сакавіка дрота-цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» выпусьціў 3.840 кгр. будаўнічых цьвікоў, або 58,1 проц. заданьня. Недазыканьне заданьня тлумачыцца недахватам дроту-катанкі.

***

26 сакавіка завод «Інтэрнацыянал» вырабіў 2.291 сотню вінтоў, або 95,5 проц. заданьня.

Папера

26 сакавіка на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» працавалі дзьве машыны, якія выраблі 21.776 кгр. паперы, або 61,7 проц. заданьня. Прастой машын з-за недахвату пары і энэргіі склаў 13 гадзін.

Абутак

27 сакавіка гомельская абутковая фабрыка «Праца» выпусьціла 2.022 пары абутку, што складае 100 проц. заданьня.

***

25 сакавіка віцебская абутковая фабрыка імя Ленерта выпрацавала 2.750 пар абутку, або 83,1 проц. заданьня. 26-га сакавіка фабрыкай выпушчана 2.930 пар, або 88,5 проц.

Швэйныя вырабы

26 сакавіка швэйная фабрыка «Кастрычнік» выпусьціла 3.539 польтаў, што складае 104,3 проц. 27-га — 3.605, або 108,4 проц. Спачатку месяца фабрыкай выпушчана 78.906 польтаў, або 111 проц. плану.

***

За пятую пяцідзёнку сакавіка магілёўская швэйная фабрыка імя Валадарскага выканала вытворчае заданьне на 114,6 проц. Спачатку месяца вытворчае заданьне выканана на 109,6 проц.

АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ ВУЧНЯЎ ВОПРАТКАЙ, АБУТКАМ І ГАРАЧЫМІ СЬНЕДАНЬНЯМІ

Пастанова камісіі выкананьня пры СНК БССР

Выслухаўшы даклад прадстаўніка НК-РСІ тав. Сьцефановіч пра вынікі праверкі выкананьня пастановы СНК БССР за 30-VIII—1931 г. «Пра забесьпячэньне вучняў вопраткай, абуткам і гарачымі сьнеданьнямі» паводле даручэньня Камісіі Выкананьня за 27 лютага 1932 г. і тлумачэньня нам. народнага камісара снабжэньня тав. Розіна, нам. народнага камісара асьветы тав. Брыгневіча і старшыня Белкаапсаюзу тав. Хаскіна, Камісія Выкананьня пры СНК БССР адзначае, што вышэйпаказаная пастанова СНК выканана ня поўнасьцю.

Народны Камісарыят Снабжэньня, Белкаапсаюз, Белкаашрамсаюз, Народны Камісарыят Асьветы, Белкалгасцэнтр, саўгастрэсты, раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы ня ўжылі патрэбных захадаў да поўнага выкананьня пастановы СНК, у выніку чаго плян забесьпячэньня вучняў вопраткай, абуткам і гарачымі сьнеданьнямі, зацьверджаны пастановай СНК 30-VIII—1931 г. і пацьверджаны 29-XII—31 г. выканан у IV квартале 1931 г. па вопратцы — 68 проц., уключаючы няплянавыя закупкі, па абутку — 69 проц., а ў I квартале 1932 г. Народным Камісарыятам Снабжэньня вызначана па вопратцы — 32 проц., абутку — 20 проц. Гарачымі сьнеданьнямі вучні ахоплены на 49 проц. (на 10-III—1932 г.).

Камісія Выкананьня пры СНК БССР — пастанаўляе:

1. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Белкаапсаюзу на працягу 5-ці дзён даць паказаньне раённым арганізацыям аб скарыстаньні вылучаных для вучняў фондаў па беспасрэдным прызначэньні і аб недапушчальнасьці скарачэньня норм прадуктаў для арганізацый гарачых сьнеданьняў.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Народнаму Камісарыяту Асьветы ўстанавіць за гэтым сыстэматычны кантроль.

2. Адзначаючы невыкананьне пастановы СНК пра арганізацыю спэцыяльных майстэрань па рамонце абутку для вучняў, прапанаваць Белкаапсаюзу, пад адказнасьць тав. Брыскіна, безадкладна выканаць гэту пастанову, а ў тых мясцох, дзе арганізаваць майстэрні немагчыма, вылучыць пасьля ўзгадненьня з НК Асьветы ў агульных майстэрнях спэцыяльны вучнёўскі фонд пачынаючы матар'ялаў.

3. Прапанаваць Белкаалхарчу, пад адказнасьць тав. Асьніна разам з прафсаюзам работнікаў народнага харчаваньня ўжыць канкрэтныя захады да паляпшэньня якасьці гарачых сьнеданьняў і поўнага ахопу імі ўсіх вучняў.

Даручыць Белкаапрамсаюзу і Белкаапсаюзу забясьпечыць усе школы патрэбным абсталяваньнем і кухонным інвэнтаром.

4. Прапанаваць НК Асьветы, пад адказнасьць тав. Брыгневіча на працягу дзьвюх дзён даць паказаньні раённым і гарадзкім аддзелам народнай асьветы:

а) аб тым, каб у плянах капітальнага будаўніцтва і рамонту школ былі прадугледжаны памяшканьні для гарачых сьнеданьняў;

б) аб арганізацыі пры школьных сталоўках сьвіварнікаў, трусоўняў, гародаў і птушкавоўства, скарыстоўваючы ўсю прадукцыю на паляпшэньне харчаваньня вучняў і прыцягваючы да гэтай справы грамадзкія і гаспадарчыя арганізацыі.

5. Прапанаваць НК Асьветы па працягу 5 дзён распрацаваць інструкцыю пра арганізацыю грамадзкага харчаваньня пры школах (нормы харчаваньня, праца камісій садзейнасьці, мабілізацыі ўнутраных сродкаў і г. д.).

6. Паказаць Белкалгасцэнтру і саўгастрэстам па невыкананьне імі пастановы СНК пра ўдзел саўгасаў і калгасаў у арганізацыі гарачых сьнеданьняў і прапанаваць паказаным арганізацыям па працягу 5 дзён даць катэгарычныя паказаньні аб дакладным выкананьні гэтай пастановы.

7. Даручыць НК Аховы Здароўя забясьпечыць правядзеньне санмінімуму ў грамадзкім харчаваньні пры школах, ужыўшы адпаведныя захады да паляпшэньня санітарна-гігіенічных умоў школ.

За старшыню Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
В. ШАРАНГОВІЧ.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
Я. ЗЛЬКІН.

У Беларускай акадэміі навук

Канфэрэнцыя па абгаварэньні новага беларускага правапісу

Прэзыдыум Акадэміі Навук пастанавіў скліканьне разам з НКА на 23 КРАСАВІКА ўсебеларускую канфэрэнцыю па разгляданьне праекту новага беларускага правапісу. Праект распрацаваны Інстытутам мовазнаўства БАН і канфэрэнцыя павінна будзе канчаткова яго абгаварыць, увесьці ў практыку работы школ, газэт, выдавецкай справы.

На канфэрэнцыю будуць запрошаны: выкладчыкі беларускай мовы пэдтэхнікумаў, папітэхнічных школ, прадстаўнікі ад фабрык і калгасаў, навуковыя работнікі.

Падрыхтоўка да ўсесаюзнай канфэрэнцыі па разьмяшчэньні прадукцыйных сіл

15 красавіка ў Маскве Дзяржплан СССР разам з навукова-дасьледчымі ўстановамі склікае ўсесаюзную канфэрэнцыю па разьмяшчэньні прадукцыйных сіл СССР у другой пяцігодцы. Прэзыдыум БАН, абгаварыўшы гэта пытаньне, пастанавіў прыняць актыўны ўдзел як у правядзеньні гэтай канфэрэнцыі, так і ў падрыхтоўчай работе да яе.

ІНСТЫТУТУ ЭКАНОМІКІ прапанавана фарсаваць работу брыгад, якія працуюць па пытаньнях аб разьмяшчэньні прадукцыйных сіл БССР. Памім 9 і 12 красавіка Акадэмія Навук, разам з Дзяржпланам, праведзе спэцыяльную нараду, на якой будуць заслуханы вынікі падрыхтоўчай работы да ўсесаюзнай канфэрэнцыі.

Новая намэнклятура навуковых работнікаў

Акадэмія Навук разам з саюзнымі навуковымі працаўнікоў БССР распрацавала новы праект намэнклятуры навуковых працаўнікоў. Згодна гэтай намэнклятуры, уводзяцца наступныя катэгорыі па кваліфікацыі навуковых працаўнікоў: АКАДЭМІКІ, ВУЧОНЫЯ СПЭЦЫЯЛІСТЫ, СТАРШЫЯ НАВУКОВЫЯ ПРАЦАЎНІКІ, НАВУКОВЫЯ ПРАЦАЎНІКІ І АСЫСТЭНТЫ.

Гэты праект паданы ў СНК БССР на зацьвярджэньне. Пасьля зацьвярджэньня ўсе навуковыя работнікі БССР будуць разьбіты, згодна гэтай намэнклятуры на катэгорыі.

Новая намэнклятура будзе мець вялікае значэньне для упарадкаваньня справы з наданьнем НАВУКОВАЙ ГОДНАСЬЦІ працаўнікам, якія вядуць навукова-дасьледчую работу.

Падрыхтоўка да 50 гадавіны з дня сьмерці Дарвіна

У адзнаку 50-годзьдзя сьмерці вялікага вучонага і мысьліцеля Дарвіна прэзыдыум таварыства біолёгаў-марксыстаў і інстытуту біялёгіі Камакадэміі праводзіць рад мерапрыемстваў. У красавіку адбудзецца ўрачыстае адкрытае пасяджэньне пленуму таварыства біолёгаў і марксыстаў з дакладамі: роля Дарвіна ў гісторыі біялёгічных навук, Дарвінізм і задачы біолёгаў-марксыстаў у распрацоўцы зваюцыйнай праблемы. У красавіку-ж адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне Камакадэміі. Інстытутам Камакадэміі і таварыствам біолёгаў даручана правесьці шырокую прапагандысцкую работу, якая павінна ўскрыць ролю Дарвіна ў гісторыі біялёгічных навук, антырэлігійнае значэньне дарвінізму, клясавую барацьбу вакол дарвінізму ў мінулым і ў даны момант, фашысцкія трактоўкі вучэньня Дарвіна і г. д.

Для абслугоўваньня заводаў, фабрык і клюбаў дакладамі аб Дарвіне [illegible] 50-[illegible] таварыства біолёгаў-марксыстаў [illegible] Мяркуе [illegible] для дэ[illegible] дзю з [illegible] ца да п[illegible] ца такс[illegible] мі біолёг[illegible] віна мяр[illegible] стаўку, я[illegible] часьць Д[illegible] і г. д.

Взаімадзеянне [illegible] разгортваньні [illegible] вабясьпячэньне [illegible] мальвасьці і а[illegible] ства, скаардынаваць [illegible] арганізацыі на [illegible] будаўніцтве, ус[illegible] гомельскі работы [illegible] тару, ужо пач[illegible] Выходзячы з [illegible] ному і Гам (да [illegible]

Паведамленьні

— Культпроп ЦК КП(б)Б склікае 31 сакавіка, у 5 гадз. веч. (пакой № 14) нараду па пытаньні аб ходзе падрыхтоўкі фронту літаратуры і мастацтва да 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. На нарадзе будуць заслуханы інфармацыі аб падрыхтоўчай рабоце да 15-годзьдзя: БелАПП — т. Лыпкова, ін-т літаратуры і БелФАСП — т. Вольскага, калоўмастацтва — т. Гурскага, па лініі тэатраў, музыкі і выяўленчага мастацтва, па лініі кіно — тав. Галіна, у галіне самадзейнага мастацтва — т. т. Клімковіча і Шампгура, па лініі літаратурнай газэты — т. Дунца і па лініі саюзу пралетпісьма — т. Гурскага. На нараду выклікаюцца камуністы-пісьменьнікі, крытыкі, літаратуразнаўцы, актэры, мастакі і кампазытары.

Нам. заг. культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

— Партыкалегія ЦКК КП(б)Б прапануе вызвіцца ў ПК, або паведаміць свой адрас ці месца працы т. Стрыпечку Уладзімеру Міхайлаву (Полацкая вул., 1). Просьба да ўсіх арганізацый, куды [illegible] месцазнаходжаньня помянёнага таварыша, паведаміць у ПК.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

2 красавіка 1932 г., у 8 гадзін вечара адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВУ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ

з парадкам дня: Аб падрыхтоўцы да весенняй сяўбы.

Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова.

(Сход адбудзецца ў рэдакцыі „ЗЬВЯЗДЗЯ“).

Чырвоная Зорка	Гуцаны мастацкі фільм ДЗЬВЕ СУСТРЭЧЫ драма ў 7 частках.
„Інтэрнацыянал“.	Замежны фільм АБШАРПАЧЫЯ ВЕТРАЗІ
ПРАЛЕТАРЫ.	Нэмецкі фільм КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА драма ў 8 част.
„СПАРТАК“	Амэрыканскі фільм НЕБАСКРОБ камэдыя ў 6 частках.

РАБОЧЫ ФАКУЛЬТЭТ

Сацыбскага пастф вы-парнага [illegible] абавяшчае, што ПРЫЕМ

заяў ад наступных на 1 курс рабфаку

ПРАЦЯГНУТ

да 15 красавіка.

Іспыты і прыёмная камісія адбудуцца 20 і 21 красавіка.

Вэтэрынарыят.

ЗГОДНА РАСПАРАДЖЭНЬНЯ НКШЗ за № 2118,

з 3/IV-32 г. уводзіцца новы парадак

МАРКІРОЎКІ ГРУЗАЎ

па адпраўленьні.

Маркіроўка павінна на месцах ставіцца самой кліентурай

НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ:

на кожным месцы ставіцца станцыя адпраўленьня Саюзтранс, назва адгрузчыка і нумар месца.

Пры адсутнасьці маркіроўкі грузы канфіскуюцца прымацца ня будуць.

Менскае аддзяленьне САЮЗТРАНС.

Паводле пастановы СНКБ ад 29-II—32 г. дзедзіцца да подпісу ўстаноў і розных асоб, ш. т. а.

Пар[illegible] пайсла-жывёлоюю

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Прэтэнзіі [illegible] быць прад'явлены

да 10 красавіка 1932 г.

пасьля чаго [illegible] лічыцца канчатка[illegible] ваным і ніякія [illegible] прымацца ня будуць.

Ліквідком.

СЭКТАР КАНСУЛЬТАЦЫІ І ІНСТ. УКІТАКУ

Бел. к-ры „САЮЗОРГУЧЕТ“

арганізуе стацыю КАНСУЛЬТАЦЫЮ

па пытаньнях зьвязаных з пераводам на зьдзельшчыну вахунковых і татыстычных апаратаў установаў і прадпрыемстваў.

Папярэдняя заяўкі прымаюцца па тэлеф. № 6-11 штодзённа з 10 да 12 гадз. дня.

„САЮЗОРГУЧЕТ“.

31 сакавіка, у 7 гадз. веч. у памяшк. нарсовета клюбу адбудзецца пасяджэньне

МЭДСЯСТРЫ

[illegible] у [illegible] дыскусіі „Этапы разьвіцьця [illegible] здароўя і перспэктывы [illegible] пяцігодку“ (т. Лёшчыц).

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ

— АБВЯШЧАЕ —

ПРЫЕМ СТУДЭНТАЎ

на 1-шы курс.

Умовы прыёму і дакументы звычайныя, як і ва ўсе тэхнікумы.

Прыём заяў да 15-га красавіка.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Плодагароднае аб'яднаньне Ленінградзкага саюзу спажывецкіх таварыстваў (ЛСПО)

паведамляе ўсе арганізацыі, што за ўсе грузы, якія адпраўляюцца ў адрас аб'яднаньня, з 1-га красавіка г. г.

ніякіх разьлікаў у Ленінградзе не праводзіцца.

Рахункі для аплаты павінны прадстаўляцца рэспубліканскай канторы п-о ЛСПО ў гор. Менск, Савецкая, 155, асобы рахунак ў Менскай канторы Дзяржбанку № 261-1360 або міжрайканторам ЛСПО ў адпаведнасьці з умовамі заключаных дагавораў.

Рахункі, накіраваныя непасрэдна ў Ленінград, АПЛАЧАНЫ НЯ БУДУЦЬ.

ПАТРАБУЕЦЦА гідраўлічаскі прэс

сумесна з насосам даўленьнем да 300 атмасфэр, або без насосу. Разьмер плітаў: су 350x600, або 600x600.

Фабрыка „Чырвоная Барэзіна“, Нова Барысаў.

Музычны магазын БЕЛГАНДЛЮ

(Менск, Ленінскае, 9, тэл. 6-84)

атрымаў

МЕДНА-ДУХАВЫЯ МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМАНТЫ.

Да першамайскіх урачыстасьцяў

заказы выконваюцца аператыўна і ў разьбіўку.

БЕЛГАНДАЛЬ.

ІНСТЫТУТ ПРАДЗІЛЬНЫХ КУЛЬТУР

абвяшчае прыём абітурыентаў на падрыхтоўчыя [illegible] сачныя

КУРСЫ

(у колькасьці 90 асоб). [illegible] ступаючыя павінны [illegible] адукацыю не ніжэй [illegible]

Заявы прымаюцца да 10 красавіка.

Заняткі пачынаюцца з 15 красавіка 1932 г.

Заявы з дакумэнтамі накіроўваюцца па адрасу: БССР г. Горкі, Інстытуту прадзільных культур.

Дырэктар Інстытуту [illegible]

МЕНСКАМУ ГАРАДЗКОМУ ПЛОДАГАРОДНАМУ ТРЭСТУ

ПРЫ БЕЛКААППЛОДАГАРОДНІНЕ

Савецкая 43, тэл. 11-44

ПАТРАБУЮЦЦА:

1) ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР,
2) 2 БУХГАЛЬТАРЫ,
3) Спэцыяліст па заколцы гуркоў і закваскі капусты.
4) Спэцыяліст па бурэваньні с